

Якія смакавыя прыярытэты беларусаў? Што мы часцей за ўсё спажываем, а чаго недаядаем? Як гэта ўсё адбіваецца на нашым здароўі? І ці шмат ГМА у прадуктах якія мы набываем? СТАР. 2



Толькі летась падчас археалагічных раскопак, якія актыўна вядуцца ў Белавежскай пушчы, было знойдзена 7000 артэфактаў. А сёлетняя экспедыцыя выявіла ў запаведніку жытло жалезнага веку! СТАР. 6



Кухары-прафесіяналы, аматары гатаваць і проста смачна паесці, сабраліся на II Міжнародны кулінарны фестываль, каб паспаборнічаць, падзяліцца сакрэтамі майстэрства і паўзельнічаць у дэгустацыях. СТАР. 8


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ЖНІЎНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 154 (27519) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


## ДЗЕ ПАЧУЦЬ УСЕ СЛАВЯНСКІЯ МОВЫ АДРАЗУ?

**Ад сённяшняга дня і на цэлы тыдзень сталіца Беларусі стане навуковым цэнтрам славянскага свету**

Больш за 600 навукоўцаў з 35 краін свету прымуць удзел у працы XV Міжнароднага з'езда славістаў. Гаворка пойдзе пра культуру, гісторыю, мову народаў славянскага свету. Але славянскі свет не існуе адасоблена, яго культура ў сучасных варунках не развіваецца толькі на традыцыйнай, этнічна акрэсленай тэрыторыі. Акрамя таго, яна ўплывае на культуру сусветную, і, наадварот, адчувае ўплывы звонку. Таму прадстаўніцтва на з'ездзе, які афіцыйна адкрыецца заўтра, будзе вельмі шырокім: гасцямі з'езда стануць даследчыкі не толькі са славянскіх краін, але і з Аўстрыі, Аўстраліі, Бельгіі, Германіі, Ізраіля, Італіі, Іспаніі, Канады, Літвы, Францыі, Швейцарыі, Японіі... Таму калі хто завітае на пасяджэнні па секцыях у Лінгвістычным універсітэце (уваход вольны), то не трэба дзівіцца, што мовы будуць гучаць самыя розныя. Усе славянскія мовы — гэта афіцыйныя мовы з'езда. А таксама англійская, нямецкая, французская... І разумець адзін аднаго навукоўцы павінны без перакладу.

Удзельнікі з'езда пачалі прыязджаць ужо ў нядзелю. І да серады — дня ўрачыстага адкрыцця — у шмат каго з іх ёсць час на тое, каб агледзецца, пазнаёміцца з беларускай сталіцай, якая любіць і ўмее прымаць гасцей. Пачынаючы ад атэляў — замежных навукоўцаў сустракаюць у гасцініцах «Мінск», «Юбілейная», «Планета», «Спадарожнік», «Акадэмічная». Акрамя таго, будзе наладжаны прыём ад імя беларускага ўрада, дзе перавага будзе аддадзена беларускай страве. І падчас працы з'езда будзе час на экскурсіі. Па жаданні, кожны можа абраць маршрут, які найбольш зацікавіў: Дудуткі, Полацк, Мір, Нясвіж, Мінск.

Міжнародны з'езд славістаў праходзіць ужо ў пятнаццаты раз з 1929 года, але наша краіна яго прымае ўпершыню. Адказнасць вялікая: не проста забяспечыць умовы плённай працы, але і прадэманстраваць гасцям славутую беларускую гасціннасць, каб у іх было ўяўленне пра асаблівасці беларускага характару і адметнасць нацыянальных традыцый. Гэта ж не жарт: да нас прыязджаюць 33 старшыні нацыянальных камітэтаў славістаў!.. Галоўнымі арганізатарамі з'езда з'яўляюцца Міжнародны камітэт славістаў, Беларускі камітэт славістаў, Нацыянальная Акадэмія Навук Беларусі. З беларускага боку далучыліся да арганізацыі міністэрствы адукацыі, культуры, інфармацыі, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

Праграма з'езда насычаная: гэта і тэматычныя блокі, праца па розных секцыях, «круглыя сталы» і дыскусіі. Напрыклад, адной з цікавых тэм падзеі стане такая: «Моўныя сітуацыі ў славянскім свеце», дзе гаворка пойдзе ў тым ліку і пра тэндэнцыі развіцця сістэм славянскіх моў у пачатку XXI стагоддзя, праблемы глабалізацыі, праблемы моўнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі.

Будзе час і на важныя сустрэчы, напрыклад, з кіраўніцтвам Нацыянальнай акадэміі навук. І знаёмства з дасягненнямі беларускіх навукоўцаў — дзейнічае нават пастаянная экспазіцыя пра гэта: "Дасягненні айчыннай навукі — вытворчасці". Навукоўцаў-славістаў могуць зацікавіць археалагічныя артэфакты (сабраныя айчыннымі даследчыкамі) і вельмі рэдкія кнігі. Што да кніг, то кніжны збор нашай краіны можа папоўніцца адметнай калекцыяй менавіта дзякуючы з'езду: ёсць прапанова ад гасцей зрабіць выставу літаратуры, якая выдавалася за апошнія пяць гадоў у розных краінах. Але пасля завяршэння з'езда кнігі застаюцца ў той краіне, якая іх прымала. І гэта ўжо важны вынік для нас, пры тым, што з'езд афіцыйна адкрываецца ў сераду.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ Надвор'е

## Удзень — яшчэ да плюс 30

У аўторак будзе сонечна, пераважна без ападкаў, толькі месцамі па паўднёвым захадзе краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. Удзень ад плюс 26 градусаў па паўночным усходзе да 32 цяпла на паўднёвым захадзе краіны. А вось у сераду да нас завітае атмасферны фронт, які прынясе навальнічныя дажджы ў паўночна-заходнія і цэнтральныя раёны краіны. У ноч на сераду плюс 11-18 градусаў, удзень — ад 24 да 30 цяпла, а па паўночным захадзе — плюс 20-23 градусы. Непрацяглыя дажджы і навальніцы прагназуюцца месцамі, пераважна на ўсходзе краіны, і ў чацвер. Раніцай і ўначы ў асобных раёнах туман. У ноч на чацвер тэмпература знізіцца да 8-15, а ўдзень — плюс 18-25 градусаў; па паўднёвым ўсходзе ўначы — 16-18 цяпла, а ўдзень — ужо плюс 26-30 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у апошнія дні тыдня на тэрыторыю Беларусі паступіць вільготная паветраная маса з боку Балтыйскага мора. Таму месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы 8-14, удзень — 18-25 цяпла. Крыху цяплей будзе ў пятніцу ўначы па паўднёвым усходзе, дзе ўначы прагназуецца плюс 15-17, а ўдзень — 26-29 градусаў. Практычна не будзе ападкаў і ў нядзелю, толькі месцамі па паўднёвым усходзе магчымы невялікія дажджы і навальніцы. Уначы стане ўжо халаднавата — толькі 6-13 цяпла, а ўдзень чакаецца плюс 20-26 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Ганна і Анастасія КАРАСЦЯЛЁВЫ.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# СПАС — УСЯМУ ЧАС

СТАР. 3

■ Соцыум

## АБАРАНІЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА З ІНВАЛІДНАСЦЮ

**Ні для каго не сакрэт, што людзі з інваліднасцю не заўсёды здольныя канкурыраваць на сучасным працоўным рынку. Ім патрэбны індывідуальны падыход: акрамя адукацыі і кваліфікацыі, наяўнасці пэўных прафесійных навыкаў і асабістых пажаданняў, абавязкова павінны ўлічвацца іх псіхафізічныя асаблівасці і медыцынскія паказанні да працы.**

**Хто і як можа дапамагчы людзям, якія маюць якія-небудзь абмежаванні па здароўі, калі іх правы на працу парушана?**

### «Індывідуальная праграма» наймальніка можа не задаволіць

Калі пагартаць Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 года № 296-З, то з арт. 283 можна даведацца па тое, што асобы з інваліднасцю маюць права працаваць у наймальнікаў са звычайнымі ўмовамі працы, а таксама ў спецыялізаваных арганізацыях, цэхах і на ўчастках — з улікам індывідуальных праграм рэабілітацыі інвалідаў (ІПРІ).

Акрамя гэтага, органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскіх, раённых выканкамаў павінны займацца рашэннем пытанняў беспрацоўя сярод інвалідаў. Тым праца не толькі паляпшае матэрыяльнае становішча, але і забяспечвае рэалізацыю прафесійнага патэнцыялу і здольнасцяў, дазваляе атрымаць больш высокі сацыяльны статус.

Але пры працаўладкаванні людзей з інваліднасцю нярэдка ўзнікаюць спрэчныя сітуацыі. Так, напрыклад, у Офіс па правах людзей з інваліднасцю звярнуўся Анатоль Міхайлавіч з Мінска, які мае трэцюю групу інваліднасці. Выпадак нетрывіяльны: яму адмовілі ў прыёме на працу, хоць адзін са сталічных аддзелаў працаўладкавання падабраў вакансію, што адпавядала прафесійнай адукацыі Анатоля Міхайлавіча і іншым заяўленым умовам наймальніка. Меркавалася, што той зможа працаваць аператарам ЭВМ у адным з магазінаў буйной гандлёвай сеткі Мінска. Дык чаму ж была атрымана адмова?

Аказваецца, у адпаведнасці з рэкамендацыямі МРЭК, Анатолю Міхайлавічу паложаны скарочаны працоўны дзень альбо дадатковы выхадны ў тыдзень. І кіраўніцтва гандлёвай сеткі патлумачыла, што супермаркет, у які жадае працаўладкавацца Анатоль Міхайлавіч, разлічаны на штодзённае абслугоўванне насельніцтва, таму рэжым працы аператараў ЭВМ вызначаны графікам «два дні работы па 11 гадзін — два дні выходныя». Гэты рэжым працы не можа ўлічыць рэкамендацыі МРЭК, таму ў працаўладкаванні было адмоўлена. Для таго каб улічыць рэкамендацыі, неабходна мяняць графік працы і адпачынку супрацоўнікаў, якія ўжо працуюць на прадпрыемстве, і ў цэлым карэктаваць рэжым працы крамы.

— Фармальна наймальнік мае рацыю. Аднак стан Анатоля Міхайлавіча таксама ўявіць нескладана: ён адчуў сябе ахвярай дыскрымінацыі, — адзначае **юрыст Офіса па правах людзей з інваліднасцю Вольга ТРЫПУЦЕНЬ.** — Практыка паказвае, што наймальнікі часцей за ўсё не хочуць працаўладкоўваць людзей з інваліднасцю, калі ім прыходзіцца змяняць усталяваны ў арганізацыі графік працы або якія-небудзь іншыя ўмовы пад рэкамендацыі ІПРІ. Гэты факт вельмі важна ўлічваць органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і падбіраць вакансіі для суіскальнікаў з улікам індывідуальных асаблівасцяў, аналізуючы індывідуальную праграму рэабілітацыі.

Юрысты рэкамендуюць аддзелам працаўладкавання і іншым структурам, якія займаюцца занятасцю насельніцтва, для прадухілення спрэчных і праблемных сітуацый больш уважліва падыходзіць да падбору вакансій і пераправяраць інфармацыю з улікам індывідуальных працоўных асаблівасцяў суіскальнікаў. Важна таксама рабіць падбор спецыялістаў, абапіраючыся на рэальныя патрэбнасці рынку працы і яго асаблівасцяў.

### Работнікам з інваліднасцю патрабуецца сацыяльная абарона — працадаўцам гэта не падабаецца

— Разбіраючы канфліктныя выпадкі ў сферы працаўладкавання людзей з інваліднасцю, варта таксама прымаць пад увагу спецыяльныя прававыя і адміністрацыйна-працэсуальныя нормы, — кажа **каардынатар праектаў Офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргей ДРАЗДОЎСКІ.** — Так, у дачыненні да працаўладкавання людзей з інваліднасцю для наймальнікаў усталяваны дадатковы абавязак запатрабаваць індывідуальную праграму рэабілітацыі інваліда. Гэта пазітыўная норма, але без дастатковай забяспечанасці і збалансаванасці яна ставіць у няёмкае становішча і наймальніка, і патэнцыйнага работніка з інваліднасцю. Таму што на практыцы ІПРІ часам становіцца дадатковым фактарам, які фарміруе негатыўнае стаўленне наймальніка да прыёму на працу інваліда. Нават атрыманне інвалідам працоўнай рэкамендацыі — досыць доўгі, які займае два, а часам і больш месяцаў, працэс. Якое прэстыжнае працоўнае месца будзе чакаць так доўга новага работніка? СТАР. 2

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Старшыня беларускага грамадскага аб'яднання «Экалагічная ініцыятыва» Юрый САЛАЎЁЎ:**

***«Улічваючы той факт, што беларускі атамны праект стартаваў, прычым стартаваў удала, у адрозненне ад літоўскага, тут усё ж такі першачарговае не пытанне экалогіі і бяспекі, а пытанне палітыкі. Трэба прызнаць, што ў адрозненне ад Вісагінскай станцыі ў Літве, лёс якой не ясны, у Беларусі атамны праект будзе рэалізаваны. Адпаведна канкурэнцыя на рынку электраэнергіі, куды ўвойдзе новы магутны гулец, узмоцніцца, а гэта падабаецца далёка не ўсім».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.08.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8910,00 | ▼ |
| Еўра | 11880,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 270,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1096,91 | ▼ |

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 30° |
| Віцебск | + 24° |
| Гомель | + 28° |
| Гродна | + 28° |
| Магілёў | + 27° |
| Мінск | + 28° |

### КОРАТКА

У Зэльве 23-24 жніўня пройдзе «Ганенскі кірмаш». Мерапрыемства мае слаўныя традыцыі яшчэ з XVIII стагоддзя, калі ў Зэльву збіраліся купцы з усёй Еўропы. Сёлета двухдзённы кірмаш разгорнецца ў цэнтральнай частцы райцэнтра і стане карысным для вытворцаў і прадаўцоў, для прыхільнікаў народнай творчасці, спартсменаў і турыстаў.

Прафілактычная акцыя ДАІ «Увага — дзеці!» пройдзе ў Беларусі з 26 жніўня па 6 верасня. У гэтым годзе падчас акцыі асаблівую ўвагу ДАІ надасць бяспечнай перавозцы дзяцей. Упор будзе зроблены на прафілактычную работу з кіроўцамі і бацькамі.

У Мінску павялічаць колькасць аўтобусных маршрутаў па дастаўцы дзяцей у школы і дзіцячыя садкі. У новым навучальным годзе будзе арганізавана 14 маршрутаў, летась іх было 12. Больш за ўсё маршрутаў будзе арганізавана ў мікрараёне Каменная Горка.

Фігурант справы аб паказе порнароліка на БелМузТБ асуджаны судом Партызанскага раёна Мінска да двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ІНДЫІ ЦЯГНІК УРЭЗАЎСЯ Ў НАТОЎП ПАЛОМНІКАЎ

У выніку наезду цягніка на людзей, якія пераходзілі чыгуначнае палатно каля станцыі горада Дхамар у індыйскім штаце Біхар, загінулі 37 чалавек, у тым ліку 30 жанчын і трое дзяцей. Раз'юшаны натоўп ледзь не лінчаваў машыніста. Інцыдэнт адбыўся раніцай у панядзелак. Людзі выходзілі з цягніка і накіроўваліся ў індуісцкі храм. У іх на хуткасці 80 км/г урэзаўся цягнік. Большасць загінулых — пілігрымы. Мясцовы тэлеканал NDTV паведамляе аб як мінімум чатырох дзясятках параненых.

### У ЕГІПЦЕ ПАСЛЯ КРЫВАВЫХ ВЫХАДНЫХ — АМАЛЬ 1000 ЗАБІТЫХ



У Егіпце падлічваюць колькасць ахвяр масавых беспарадкаў, якія адбыліся ў краіне ў мінулыя выхадныя. Па апошняй інфармацыі, колькасць забітых за гэты час перавысіла 100 чалавек. Агульная колькасць загінулых за чатыры дні складае, па некаторых звестках, 924 чалавекі.

У мінулую пятніцу ў Егіпце быў абвешчаны «дзень гневу». Падчас акцый пратэсту, арганізаваных ісламістамі, загінулі 173 чалавекі. 95 з іх сталі ахвярамі сутыкненняў падчас маніфестацый у Каіры. У суботу колькасць ахвяр супрацьстаяння павялічылася яшчэ на 79 чалавек, перадало егіпецкае дзяржаўнае інфармацыйнае агенцтва Mena. У нядзелю прыхільнікі ісламістаў напалі на грузавік, у якім перавозілі больш за 600 затрыманых падчас вулічных сутыкненняў у Каіры. Каб не дапусціць уцёкаў, паліцэйскія выкарысталі слёзатачывы газ. У выніку не менш як 36 затрыманых загінулі ад удушша.

### «АЛЬ-КАІДА» РЫХТУЕ СЕРЫЮ ТЭРАКТАЎ НА ЕЎРАПЕЙСКІХ ЧЫГУНКАХ

Міжнародная тэрарыстычная арганізацыя «Аль-Каіда» плануе серыю тэрактаў на хуткасных чыгуначных магістралях у Еўропе, перадаюць інфармагенцтвы са спасылкай на нямецкую газету «Bild». Інфармацыя пра запланаваныя акцыі паступіла ад амерыканскага Агенцтва нацыянальнай бяспекі (АНБ), якое некалькі тыдняў таму перахапіла тэлефонную размову высокапастаўленых камандзіраў «Аль-Каіды». Згодна з атрыманай інфармацыяй, яны маюць намер арганізаваць падрывы чыгуначнага палатна, тунэляў, ліній электраперадач у шэрагу краін Еўропы. Паводле інфармацыі выдання, у сувязі з узніклай пагрозай улады Германіі яшчэ два тыдні таму распарадзіліся ўзмацніць кантроль над трасамі руху хуткасных цягнікоў і вакзаламі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### СМАРТФОНЫ СПРЫЯЮЦЬ РАЗВІЦЦЮ ХВАРОБ ВАЧЭЙ



Паводле звестак акуліста Дэвіда Эламбі, з моманту выхаду смартфонаў на рынак у 1997 годзе колькасць пацыентаў з блізарукасцю павялічылася на 35%. У бліжэйшыя 10 гадоў колькасць дзяцей з блізарукасцю можа вырасці на 50%, піша Business Standard. Даследаванне паказала: людзі трымаюць тэлефоны на адлегласці ўсяго 18-30 сантыметраў ад вачэй. А вось газеты і кнігі — на адлегласці 40 сантыметраў. У сувязі з гэтым можна казаць пра блізарукасць, выкліканую выкарыстаннем мабільных прылад з маніторамі. «Людзі павінны абмяжоўваць час выкарыстання смартфонаў. Прычым улічваецца нават час, калі яны карыстаюцца тэхнікай на вуліцы. Таксама вельмі важна сачыць за тым, каб зусім маленькія дзеці не выкарыстоўвалі смартфоны. Дарэчы, знаходжанне на сонцы павінна затармазіць развіццё блізарукасці», — канстатуе Эламбі. Паводле яго слоў, сучаснае пакаленне дзяцей знаходзіцца ў асаблівай групе рызыкі развіцця блізарукасці, вядомай таксама як міяпія. Смартфоны купляюць нават самым маленькім дзецям — з сямігадовага ўзросту.

■ Школа падаткаплацельшчыка

## ІЛЬГОТА НА НЕРУХОМАСЦЬ — І ДЛЯ ВЯСКОЎЦАЎ

**Аб тым, якія змены адбыліся ў падатковым заканадаўстве для грамадзян — плацельшчыкаў падатку на нерухомасць і зямельнага падатку, рэдакцыі паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.**

У парадку вылічэння і выплаты фізічнымі асобамі падатку на нерухомасць і зямельнага падатку сёлета адбыліся толькі нязначныя змяненні. У прыватнасці, быў удакладнены парадак вызначэння падатковай базы зямельнага падатку. З першых дзён года падатковая база зямельнага падатку будзе вызначацца па стане на 1 студзеня каляндарнага года ў беларускіх рублях шляхам пераліку кадастравага кошту, які вызначаны ў доларах, паводле афіцыйнага курсу Нацыянальнага банка Беларусі, устаноўленага на 1 студзеня каляндарнага года, за які робіцца падлік падатку. Сёлета быў пашыраны пералік аб'ектаў нерухомасці, у дачыненні да якіх грамадзянам даецца льгота ў выглядзе поўнага вызвалення ад выплаты падатку на нерухомасць. Так, вызваляецца ад падатку на нерухомасць адно жылое памяшканне (кватэра, пакой) у блакіраваным жылым доме, якое належыць фізічнай асобе на праве ўласнасці. Раней такая льгота прадастаўлялася толькі на жылыя памяшканні ў шматкватэрных жылых дамах.

Акрамя таго, канкрэтызаваны тэрмін уручэння плацельшчыкам — фізічным асобам паведамленняў на выплату падатку на нерухомасць і зямельнага падатку ў выпадку набыцця, атрымання або ўзвядзення імі капітальнага будынка або зямельнага ўчастка пасля 1 жніўня бягучага года. Паведамленні будуць уручацца ў трыццацідзённы тэрмін з дня атрымання падатковым органам інфармацыі аб такім аб'екце нерухомасці.

**ЯК ПАМЕНШЫЦЬ ЭКАЛАГІЧНЫ ПАДАТАК?**

Сёлета плацельшчыкі могуць паменшыць вылічаную суму экалагічнага падатку за выкіды забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, у тым ліку на суму засвоеных капітальных укладанняў (за выключэннем капітальных укладанняў, што фінансуюцца з бюджэту) у будаўніцтва і (або) рэканструкцыю ўстановак па выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі. Разам з тым, у асобных спецыялістаў былі пытанні наконт таго, якія крыніцы энергіі адносяцца да аднаўляльных.

У падатковым ведамстве нам патлумачылі, што да аднаўляльных крыніц энергіі адносіцца энергія сонца, ветру, цяпла зямлі, натуральнага руху водных патокаў, драўнянага паліва, іншых відаў біямасы, біягазу, а таксама іншыя крыніцы энергіі. Падаткаплацельшчыкі, якія ажыццяўляюць капітальныя ўкладанні ва ўстаноўкі, што выкарыстоўваюць такія крыніцы энергіі і такім чынам дапамагаюць эканоміць выкапнёвыя рэсурсы, маюць права кампенсаваць панесеныя выдаткі за кошт нявыплаты экалагічнага падатку.

**Штогод уносяцца змяненні і дапаўненні ў пералік зямельных участкаў, якія прызнаюцца ці не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання зямельным падаткам; удакладняецца склад існуючых ільгот. Што новага ў гэтым кірунку распрацавана сёлета?**

У 2013 годзе ў пералік зямельных участкаў, якія не прызнаюцца аб'ектамі падаткаабкладання зямельным падаткам, перайшлі землі запаведнікаў, нацыянальных і дэндралагічных паркаў, батанічных садоў; зямельная паласа, якая праходзіць непасрэдна ўздоўж Дзяржаўнай мяжы. Разам з тым, сёлета ўжо не маюць падатковую льготу тыя зямельныя ўчасткі, што знаходзяцца ў стадыі сельскагаспадарчага засваення або паляпшэння іх стану, а таксама зямельныя ўчасткі, у дачыненні да правоў на якія заканадаўствам устаноўлены абмежаванні.

**ЦІ АДБЫЛІСЯ ЗМЕНЫ Ў ТЭРМІНАХ ВЫПЛАТЫ ЗЯМЕЛЬНАГА ПАДАТКУ ДЛЯ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ?**

Так, сёлета плацельшчыкі атрымалі права аплаціць зямельны падатак адзін раз у год — не пазней за 22 лютага бягучага года, альбо, як і раней, плаціць падатак штоквартальна. Акрамя таго, па сельскагаспадарчых землях Падатковым кодэксам былі вызначаны спецыяльныя тэрміны выплаты, якія адрозніваюцца ад тэрмінаў выплаты падатку па зямельных участках іншага прызначэння. З гэтага года арганізацыі самастойна могуць выбіраць, як ім выплачваць зямельны падатак па землях сельгаспрызначэння: у спецыяльныя тэрміны, устаноўленыя для такіх зямель, альбо ў агульнаўстаноўленыя, пакавартальна або адзін раз у год.

**Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ**

# РЫНАК ЗДАРОВАГА ХАРЧАВАННЯ

**Народная мудрасць гаворыць: усе нашы хваробы ад нерваў. Але тут варта было б дадаць — і ад няправільнага харчавання. Наша самаадчуванне залежыць непасрэдна ад таго, што мы ядзім, але не ўсе надаюць гэтаму асаблівае значэнне. Аб тым, якім павінен быць правільны рацыён харчавання, як сфарміраваць яго ў дзяцей, дзе ў Беларусі знайсці «здаровыя» прадукты і калі ў рэспубліцы з'явіцца Канцэпцыя здаровага харчавання, карэспандэнт БЕЛТА размаўляе з начальнікам аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні кандыдатам біялагічных навук Людмілай Мельнікавай.**



***— Людміла Аляксандраўна, раскажыце аб асноўных прынцыпах здаровага харчавання. Ці адрозніваюцца гэтыя правілы для розных узроставых груп насельніцтва?***

— Асноўныя прынцыпы рацыянальнага харчавання распрацаваны Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя. Іх пяць, і згодна з імі харчаванне павінна быць умераным, збалансаваным па незаменных харчовых рэчывах, чатырохразовым, прычым кожны прыём ежы прадугледжвае параўнальна невялікую яе колькасць, разнастайным і паўнацэнным. Апошняму прынцыпу надаецца асаблівае значэнне. Галоўнае тут — штодзённае ўжыванне свежай агародніны, садавіны і зеляніны.

Гэтыя прынцыпы ўніверсальныя, і калі іх захоўваць, то ва ўсіх груп насельніцтва ёсць шанц пазбегнуць праблем з лішняй вагой. Калі ж гаварыць аб нормах фізіялагічных патрэбнасцяў у харчовых рэчывах і энергіі, то яны, вядома, розныя для мужчын і жанчын, дзяцей і падлеткаў. У Беларусі распрацаваны такія нормы, іх можна знайсці ў дзяржаўным нарматыўным дакуменце, які вызначае велічыні аптымальных патрэбнасцяў у харчовых рэчывах і энергіі для розных груп насельніцтва.

***— Па статыстыцы мінулага года, амаль 30 працэнтаў беларусаў пакутуюць ад атлусцення. Асабліва актуальная гэта праблема адносна дзяцей і моладзі. Якія шляхі яе вырашэння вы бачыце? Як сфарміраваць прывычкі здаровага харчавання ў дзіцяці?***

— Дзіцячае атлусценне даволі актуальная праблема, паколькі вядзе да сур'ёзных парушэнняў як фізічнага, так і псіхічнага здароўя дзіцяці.

Навучыць дзяцей есці карысную і здаровую ежу няпроста. У 2011-2012 гадах у рамках дзяржаўнай навуковай праграмы «Дзіцячае харчаванне» мы даследавалі спажывецкія густы навучэнцаў пры выбары прадуктаў харчавання. Аказалася, што харчовыя густы падлеткаў з сярэдніх школ горада Мінска — гэта фастфуд, ласункі, паўфабрыкаты глыбокай тэхналагічнай апрацоўкі, салодкая газіроўка, энергетычныя напіткі, чыпсы. На гэта накладваецца нерэгулярнае харчаванне, аднастайная ежа, перавышэнне колькасці ежы, сядзячы спосаб жыцця перад камп'ютарам. Як вынік, назіраецца павелічэнне колькасці дзяцей з лішняй вагой.

Праведзеныя апытанні сярод бацькоў паказваюць, што толькі 10 працэнтаў з іх усведамляюць, што харчаванне аказвае сур'ёзны ўплыў на здароўе, і прывіваюць культуру здаровага харчавання падрастаючаму пакаленню. Таму каб дзеці раслі здаровымі, у першую чаргу самі бацькі павінны навучыцца правільна харчавацца і навучыць гэтаму сваіх дзяцей. Уважлівы падбор прадуктаў, правільна арганізаваны рэжым харчавання, кантроль за колькасцю і якасцю ежы, стымуляцыя рухальнай актыўнасці — гэта тое нямногае, што дапаможа дзіцяці ў далейшым быць здаровым чалавекам.

***— Якія смакавыя густы ў беларусаў? Якія прадукты яны часцей за ўсё спажываюць, а чаго недаядаюць?***

— Беларусы з-за сваіх прывычак ужываюць больш, чым трэба, тлустых малочных і мясных прадуктаў. Прычым мяса мы часцей ядзім не ў натуральным выглядзе, а ў выглядзе разнастайных сасісак і каўбас, у якіх — 30-40 працэнтаў тлушчу. Хлеба, булачак з мукі вышэйшага гатунку, бульбы ў нашым рацыёне таксама залішне, а вось агародніны, садавіны, зеляніны, злакаў, рыбы і морапрадуктаў мы недаядаем. Акрамя таго, вельмі любім салодкае і прывучаем да яго дзяцей.

У нашым рацыёне пераважаюць насычаныя жывёльныя тлушчы і лёгкія вугляводы. Як вынік, згодна з праведзенымі даследаваннямі, беларусы, асабліва падлеткі і людзі сталага ўзросту, адчуваюць недахоп не толькі ў вітамінах A, D, C, $B_1$, $B_2$, фоліевай кіслаце, але таксама ў харчовых валокнах, поліненасычаных тлустых кіслотах, мінеральных рэчывах, такіх як магній, кальцый, жалеза, ёд, селен.

***— Апошнім часам стала модна адмаўляцца ад ужывання мяса і станавіцца вегетарыянцам або сыраедам. Плюсы і мінусы такога харчавання, якія ёсць супрацьпаказанні?***

— Адносіны да вегетарыянства неадназначныя нават сярод спецыялістаў. Адны даследчыкі прызнаюць вегетарыянскую дыету адэкватнай, іншыя пацвярджаюць, што ў рацыёне ў абавязковым парадку павінен быць бялок жывёльнага паходжання. Адназначна можна сцвярджаць, што доўгае прымяненне строгага вегетарыянства, пры якім выключаюцца любыя віды мяса жывёлы, птушак, рыб, морапрадукты, а таксама малако і малочныя прадукты, яйкі, з гадамі прыводзіць да рэзкага дэфіцыту жалеза, цынку, кальцыю, вітамінаў A, $B_2$, $B_{12}$, D, незаменных амінакіслот. Хоць колькасць жалеза, медзі, цынку ў рацыёнах строгіх вегетарыянцаў можа быць дастатковай, але засваяльнасць іх з раслінных прадуктаў нізкая. Нават у здаровых людзей, якія выключылі са свайго рацыёну ўсе прадукты жывёльнага паходжання, могуць развівацца дысбіёз, гіпавітаміноз і бялковая недастатковасць.

Улічваючы, што вегетарыянства не можа забяспечыць павышаную патрэбнасць у лёгказасваяльным кальцыі, у жанчын у перыяд постменапаўзы і ў пажылых людзей высокая рызыка развіцця астэапарозу. Таксама вядома, што лёгказасваяльнае жалеза знаходзіцца толькі ў прадуктах жывёльнага паходжання, недахоп яго ў вегетарыянскай дыеце можа прыводзіць да развіцця жалезадэфіцытнай анеміі. Такім чынам, строгае вегетарыянства нельга лічыць рацыянальным харчаваннем для дзяцей, падлеткаў, цяжарных жанчын, кормячых маці, пажылых людзей, спартсменаў.

***— Як вы ацэньваеце беларускі рынак прадуктаў здаровага харчавання і ці шырока прадстаўлены прадукты для алергікаў, людзей, хворых на дыябет?***

— Рынак здаровага харчавання ў Беларусі толькі пачынае развівацца. Але яго важнасць і перспектыўнасць усведамляюць усе, хто займаецца вытворчасцю і продажам такіх прадуктаў.

Да прадуктаў здаровага харчавання адносяць арганічныя, функцыянальнага прызначэння і БАДы. Арганічнымі або экалагічна чыстымі прадуктамі называюць тыя, што атрыманы ў натуральных умовах без выкарыстання ГМ-тэхналогій, хімічных угнаенняў, гармонаў росту, харчовых дабавак. Цяпер у Беларусі адсутнічае прававая база, якая датычыцца арганічнай вытворчасці, няма дзяржаўных стандартаў і адпаведных тэхналагічных нарматываў. Пакуль што ніводнае сельгаспрадпрыемства ў нашай краіне не мае сертыфіката на выпуск такой прадукцыі. Таму сур'ёзна гаварыць аб наяўнасці арганічных прадуктаў на паліцах нашых магазінаў лічу неабгрунтаваным.

На рынку функцыянальных прадуктаў сітуацыя іншая. У 2007 годзе ў Беларусі зацверджаны і ўведзены ў дзеянне стандарт, які ўстанаўлівае тэрміны і паняцці ў гэтай галіне. Так, функцыянальным лічыцца прадукт харчавання, абагачаны фізіялагічна функцыянальнымі інгрэдыентамі для захавання і паляпшэння здароўя. Рынак такіх прадуктаў у нашай краіне актыўна фарміруецца. Умоўна яны прадстаўлены некалькімі групамі, сярод якіх можна адзначыць збожжавыя, малочныя прадукты і безалкагольныя напіткі.

Адносна вытворчасці ў Беларусі прадуктаў для лячэбнага харчавання пытанне застаецца адкрытым. Яны ствараюцца на стыку дыеталогіі і фармакалогіі для лячэння і прафілактыкі сацыяльна значных захворванняў, напрыклад, такіх як алергія і дыябет. Пры гэтым функцыянальныя інгрэдыенты, дабаўленыя ў такія прадукты, павінны даказаць сваю медыцынскую перавагу ў стандартызаваных клінічных даследаваннях.

***— Ці з'яўляюцца такімі ўжо небяспечнымі прадукты, якія змяшчаюць трансгенныя рэчывы, як аб гэтым гавораць некаторыя СМІ? Якая іх доля на беларускім рынку?***

— Спрэчкі аб бяспецы для арганізма чалавека прадуктаў харчавання на аснове генна-мадыфікаваных аб'ектаў вядуцца ва ўсім свеце. Аднак пакуль што ні ў праціўнікаў, ні ў прыхільнікаў ГМА няма дастатковай колькасці аргументаў і навуковых фактаў па гэтым пытанні.

Разам з тым, у Беларусі распрацавана і бесперапынна ўдасканальваецца сістэма кантролю за абаротам ГМА, якая ўкаранёна ў практыку дзяржаўнага нагляду, санэпіднагляду, аграпрамысловага комплексу краіны, мытнай службы і іншых зацікаўленых ведамстваў.

Існуе таксама пералік харчовай сыравіны і прадуктаў харчавання, якія падлягаюць кантролю за наяўнасцю ў іх ГМ-складальнікаў. У яго ўключаны прадукты з генетычна мадыфікаванай соі і кукурузы. У адпаведнасці з пастановай Саўміна такія прадукты падлягаюць абавязковай маркіроўцы з пазначэннем звестак аб тым, што яны з'яўляюцца генетычна мадыфікаванымі або ў іх саставе ёсць такія кампаненты.

Маніторынгавыя даследаванні паказваюць, што колькасць прадукцыі, якая змяшчае ГМА, на рынку Беларусі адносна невялікая і ў апошнія гады захоўваецца на ўзроўні 1 працэнта. Так што ні аб якой перавазе ГМА над традыцыйнай прадукцыяй не можа быць і размовы.

***— Купляючы прадукты ў магазіне, на што трэба звярнуць асаблівую ўвагу, у тым ліку ў радку «састаў»?***

— Калі гаварыць аб харчовых дабаўках, якія ўваходзяць у састаў прадукту, то нічога лішняга туды не дабаўляюць. Калі прадукт дазволены для выкарыстання, ён апрыёры бяспечны для нас, няхай гэта будзе ГМА, харчовыя дабаўкі, фарбавальнікі, эмульгатары, стабілізатары і г.д. Іх дабаўляюць роўна столькі, колькі патрэбна для дасягнення тэхналагічнага эфекту, і гэта вельмі строга кантралюецца дзяржавай у розных акрэдытаваных лабараторыях.

А вось на што сапраўды трэба звяртаць увагу пры куплі, дык гэта на тэрмін прыгоднасці прадукту, таму што калі ён скончыўся, прадукт можа стаць небяспечным для здароўя. Пасля куплі трэба абавязкова паглядзець на этыкетцы, як захоўваць прадукт, пры якой тэмпературы, колькі яго можна захоўваць пасля адкрыцця. І, вядома, часцей заглядаць у халадзільнік, наводзіць там парадак, таму што нават калі мы купляем першапачаткова бяспечныя прадукты, яны могуць нанесці шкоду нашаму здароўю пры няправільным захаванні і ўжыванні.

**Хрысціна РАШАНОК,**
**БЕЛТА.**

## ВУЧОБА Ў АЎТАШКОЛАХ У 2013 ГОДЗЕ ЗНАЧНА ДАРАЖЭЦЬ НЕ БУДЗЕ

**Падстаў для значнага павышэння кошту ў беларускіх аўташколах няма, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела бяспекі транспартнай дзейнасці ўпраўлення тэхнічнай палітыкі Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі Павел БРЭЧКА, каментуючы планы па абсталяванні вучэбных аўтамабіляў відэарэгістратарамі і магчымы ў сувязі з гэтым рост цэн на вучобу.**

Урад Беларусі зацвердзіў план работы па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў. Падрыхтоўка змяненняў у СТБ 1567-2005 «Сродак транспартны вучэбны механічны. Патрабаванні да дадатковага абсталявання і метады праверкі», сярод якіх можа аказацца прадпісанне па відэарэгістратарах, аднесена на снежань гэтага года. «Я не думаю, што праект з'явіцца раней», — сказаў начальнік аддзела.

«У гэтым годзе курсантаў у аўташколах павышэнне аплаты з-за патрабаванняў па аснашчэнні аўтамабіляў новымі прыборамі не закране», — запэўніў ён. «Разам з тым, калі будзе прынята рашэнне аб паўсюдным выкарыстанні такіх устройстваў, пэўнае павелічэнне кошту навучання пасля магчыма», — заўважыў спецыяліст.

Павел Брэчка падкрэсліў, што пры станоўчым вырашэнні пытання аб дадатковым аснашчэнні вучэбных аўтамабіляў трэба, каб бюджэтныя арганізацыі заклалі сродкі на закупку абсталявання. «Але нават калі з'явяцца новыя патрабаванні, хтосьці захоча павышаць цэны, хтосьці — не. Некаторыя могуць за кошт свайго прыбытку адначасова ўнесці патрэбную суму, а кошт навучання пакінуць на ранейшым узроўні, таму нельга сказаць: чакайце масавага і аднаразовага падаражэння», — дадаў ён. Цяпер цэны рэгулююцца рыначным спосабам у залежнасці ад попыту і прапанавання і могуць значна вар'іравацца.

Паводле слоў Паўла Брэчкі, прымяненне ў аўташколах відэарэгістратараў дасць магчымасць павялічыць кантроль за практычным навучаннем і забяспечыць магчымасць ацэнкі выканання курсантамі практычных заняткаў. Неабходна прыйсці да агульнай думкі зацікаўленых дзяржаўных органаў, якім чынам і за які часовы перыяд планы рэальна выканаць, сфарміраваць заканадаўчую базу. «Імкнуцца да выкарыстання новых тэхналогій трэба», — упэўнены спецыяліст. На яго думку, для вырашэння такога пытання спатрэбіцца не менш як год.

## АБАРАНІЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА З ІНВАЛІДНАСЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Пры гэтым досыць складаная і працяглая па часе працэдура атрымання ІПРІ не заўсёды гарантуе працаўладкаванне. Звязана гэта з тым, што рэкамендацыі фарміруюцца дактарамі-экспертамі па інструкцыях і пераліках прафесій, якія становяцца састарэлымі яшчэ да іх сцвярджэння, — акцэнтуе ўвагу Сяргей Драздоўскі. — І як мы пераконваемся, дастатковых механізмаў абароны і кампенсацыі з боку прававой сістэмы тут няма.

### Як абараніць працоўныя правы інваліду?

Сяргей Драздоўскі перакананы, што ў розных сферах у розных рэгіёнах краіны ўзнікае мноства такіх спрэчных працоўных сітуацый. Аднак, як правіла, скардзіцца людзі пачынаюць, толькі калі «накіпела». Людзі з інваліднасцю нярэдка забываюць, што маюць такія ж правы на працу, як і ўсе астатнія. І калі гэтыя правы парушаюцца, заўсёды ёсць магчымасць іх абараніць. Ці хаця б паспрабаваць гэта зрабіць.

Як паводзіць сябе чалавеку пры парушэнні яго працоўных правоў, куды лепш звярнуцца, мы папрасілі расказаць **юрыста Алега ГРАБЛЕЎСКАГА.**

Дык вось, калі вы лічыце, што вашы працоўныя правы парушаны, то маеце права звярнуцца ў наступныя інстанцыі:

— У калегію адвакатаў па прававую дапамогу. Гэты крок падыходзіць і для тых, хто мае намер працаўладкавацца, і для тых, хто ўжо працуе. Калегія адвакатаў бясплатна аказвае юрыдычную дапамогу: пазоўнікам — у судах першай інстанцыі пры вядзенні спраў, звязаных з працоўнымі праваадносінамі; інвалідам першай і другой групы — вусныя кансультацыі, якія не патрабуюць азнаямлення з дакументамі.

— У прафсаюз па прававую дапамогу. Не варта грэбаваць такой магчымасцю.

— У некамерцыйныя арганізацыі і сродкі масавай інфармацыі. Напрыклад, у Офіс па правах людзей з інваліднасцю, які аказвае прававую дапамогу. Зварот у СМІ таксама можа быць вельмі дзейсным.

— На юрыдычныя інтэрнэт-рэсурсы. Сёння вялікая колькасць прававых сайтаў прапануюць анлайн-кансультацыі.

— У пракуратуру са скаргай на дзеянні ці, наадварот, бяздзейнасць службовай асобы, арганізацыі, прадпрыемства, установы. У выпадку выяўлення парушэння пракурор мае права вынесці прадстаўленне аб ліквідацыі парушэння заканадаўства.

— У Дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь са скаргай альбо заявай. Гэта — спецыяльна ўпаўнаважаны орган нагляду за выкананнем заканадаўства аб працы.

— Да вышэйстаячых асоб. Ёсць магчымасць накіраваць скаргі вышэйшым службовым асобам і ў вышэйстаячыя службовыя арганізацыі. Напрыклад, калі прадпрыемства ўваходзіць у структуру якога-небудзь міністэрства, можа быць эфектыўным зварот са скаргай да міністра.

— Са скаргамі ў іншыя дзяржорганы, якім наўпрост хоць і не падпарадкоўваецца суб'ект, што парушыў працоўныя правы, але якія маюць уплыў. Калі парушэнне правоў чалавека мае антыканстытуцыйны характар, можна звярнуцца са скаргай у Канстытуцыйны Суд. І хоць ён не ўпаўнаважаны рэагаваць на звароты фізічных асоб, зафіксаваны выпадкі, калі ім разглядаюцца такія скаргі.

— У суд з іскавай заявай аб аднаўленні парушаных правоў. Як правіла, да складання іскавай заявы патрабуецца выкананне абавязковых дасудовых прававых працэдур (у залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі), таму важна знайсці магчымасць атрымання кваліфікаванай прававой дапамогі.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Рэха падзеі

# НАПЕРАД, ДА ГЕАПАЛІТЫКІ МІРНАГА АТАМА!

**17 жніўня ў беларускім Астраўцы прайшлі грамадскія слуханні, прысвечаныя пытанням бяспекі будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў нашай краіне.**

Слуханні прайшлі нават больш чым проста прадказальна. У папярэднія два гады беларускі бок прыняў усе неабходныя намаганні ў рамках сваіх міжнародных абавязацельстваў для інфармавання кампетэнтных органаў Літвы. І 17 жніўня беларусы на высокім узроўні арганізавалі і правялі мерапрыемствы.

Літоўскі бок паслядоўна ігнараваў свае міжнародныя абавязацельствы ў дачыненні да Беларусі, а таксама да ўласнага насельніцтва і ўсяляк зацягваў і сабатаваў завяршэнне пагаджальных працэдур. І 17 жніўня афіцыйныя прадстаўнікі Літвы адмовіліся прымаць удзел у слуханнях. З Літвы прыехалі журналісты, зацікаўленыя эксперты і грамадскія дзеячы, выслухалі беларускі бок, задалі свае чаканыя пытанні і атрымалі на іх чаканыя прафесійныя адказы (якія, дарэчы, ужо агучваліся і накіроўваліся ў Літву шмат разоў, у тым ліку — на літоўскай мове).

Затым бакі абмяняліся таксама чаканымі заявамі, ніяк не звязанымі са зместам слуханняў. МЗС Літвы ў асобе міністра Лінаса Лінкявічуса заявіла, што беларусы «зладзілі шоу» і не выконваюць свае міжнародныя абавязацельствы, таму, маўляў, літоўскія чыноўнікі праігнаравалі слуханні. Беларусы ж раней яшчэ раз пацвердзілі сваю прыхільнасць да выканання міжнародных абавязацельстваў і адкрытасць у працэсе будаўніцтва Астравецкай АЭС.

Напярэдадні слуханняў мы ўжо пісалі пра тое, што літоўскі бок, хутчэй за ўсё, захавае сваю неканструктыўную пазіцыю. Але зараз, на наш погляд, з'явілася падстава, каб удакладніць гэтае бачанне.

З аднаго боку, дзеянні Вільнюса прадыктаваны карыслівымі інтарэсамі. Калі ў праектныя тэрміны будзе створана Беларуская АЭС, то будаўніцтва ўласнай, літоўскай АЭС у Вісагіне будзе ўжо немэтазгодным. У падобным ключы літоўскі бок ужо фактычна сарваў будаўніцтва Балтыйскай АЭС у Калінінградзе. Тут нашы суседзі сумесна з Польшчай і Латвіяй заявілі, што не будуць купляць электраэнергію з расійскага анклава, тым самым пазбавіўшы праект экспартных перспектыў. Такім чынам, у Вільнюса быццам бы свая паслядоўная лінія.

Але з другога боку, ёсць у гэтай справе адна нестыкоўка. Большасць літоўцаў на нядаўнім рэферэндуме ўжо выказалася супраць будаўніцтва ў Літве ўласнай АЭС. І гэтае рашэнне вымушана была прызнаць прэзідэнт краіны Даля Грыбаўскайтэ. У чым жа тады сэнс далейшага сабатажу праекта Беларускай АЭС?

Мне чамусьці думаецца, што сэнс якраз у самім сабатажы. Задача літоўскага МЗС — прадухіліць рэалізацыю і беларускага, і расійскага праектаў. Пры тым, што літоўскі праект будаўніцтва АЭС таксама рэалізоўвацца не будзе. І ўсе гэта ведаюць.

Справа ў тым, што стварэнне любой буйной АЭС істотна зменіць энергетычны баланс у рэгіёне і міжволі стане імпульсам для яго прамысловага развіцця. Але Літва ад прамысловага развіцця адмовілася даўно і незваротна, перайшоўшы да існавання ў рэжыме міграцыйна-датацыйнай эканомікі. А буйным гульцам у ЕС і ўплывовым пазарэгіянальным дзяржавам прамысловае развіццё ў Цэнтральнай Еўропе ўвогуле не трэба: свая прамысловасць недазагружана. Патрэбны толькі рынкі збыту, танная рабочая сіла і палітыкі, якія ахвотна ўвязваюцца ў геапалітычныя авантуры, — якраз тое, што дадуць пазбаўленыя індустрыі і ўласнай энергетыкі краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Таму разважаць аб паслядоўнасці і рацыянальнасці літоўскага боку ў сітуацыі, якая зараз склалася, бессэнсоўна.

Сэнс мае толькі адно: перайсці да актыўнага этапу будаўніцтва АЭС, па магчымасці скарачаючы тэрміны рэалізацыі праекта (вядома, не ў шкоду бяспецы). І праз пяць гадоў выйсці на прынцыпова новы ўзровень энергетычнай забяспечанасці рэгіёна, стварыўшы ўмовы для індустрыяльнага і прамысловага адраджэння Цэнтральнай Еўропы.

**Юрый ЦАРЫК,**
**палітычны аналітык,**
**кіраўнік**
**Беларускай групы развіцця.**

## СІСТЭМА «БЕЛКАРТ» АТРЫМАЛА АСОБНЫ ЮРЫДЫЧНЫ СТАТУС

**Днямі адбылося падпісанне дагавора аб стварэнні ЗАТ «Белкарт», заснавальнікамі якога сталі: акцыянернае таварыства «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр», Беларусбанк, Белаграпрамбанк і Белінвестбанк.**

Мяркуецца, што створанае таварыства будзе ажыццяўляць арганізацыйнае суправаджэнне функцыянавання плацежнай сістэмы «БелКарт», яе метадалагічнае і інфармацыйнае забеспячэнне. Вылучэнне аплатнай сістэмы «БелКарт» у асобную юрыдычную асобу павысіць яе кіравальнасць, дазволіць больш актыўна дзейнічаць па пытаннях стратэгіі і аператыўна выбудоўваць тактыку, каб усяляк спрыяць развіццю рынку айчынных плацежных картак. Засяроджванне кіравання ў руках вядучых удзельнікаў сістэмы, каардынацыя бізнес-палітыкі гульцоў фінансавага рынку дае падставы спадзявацца, што плацежная сістэма «Белкарт» зойме стабільна лідзіруючыя пазіцыі ў нашай краіне.

Даведка «Звязды»: зараз доля «БелКарт» на рынку Беларусі складае 46,54% па колькасці карт у абарачэнні. У склад удзельнікаў гэтай аплатнай сістэмы ўваходзіць 20 беларускіх банкаў. Беларусбанк з'яўляецца ўдзельнікам сістэмы «БелКарт» з 1996 года. У агульнай долі эмітаваных усімі банкамі картак «БелКарт» Беларусбанк, з аб'ёмам эмісіі ў 3,3 млн картак (64%), упэўнена займае ў краіне 1-е месца.

У прэс-службе Беларусбанка нам паведамілі, што цяпер гэтай фінансавай установай прапануецца шырокі спектр картачных прадуктаў «БелКарт», у тым ліку для дзяцей, студэнтаў і карпаратыўных кліентаў. Асаблівым поспехам карыстаюцца ашчадныя карткі, якія дазваляюць атрымліваць дадатковы даход у выглядзе павышанага працэнта на суму грашовых сродкаў на рахунку.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## ШКОЛЬНАЯ ФІЗІКА: ЦЯПЕР НЕ ТОЛЬКІ ТЭОРЫЯ?

**Згодна з Праграмай развіцця агульнай сярэдняй адукацыі, на аснашчэнне вучэбных кабінетаў фізікі ў беларускіх школах прадугледжана выдаткаваць у 2013 годзе 150 млрд рублёў. Спецыялістамі Нацыянальнага інстытута адукацыі быў распрацаваны пералік адпаведных прыбораў і інструментарыя, які павінен быць прадстаўлены ў сучасным кабінеце фізікі.**

Міністэрствам адукацыі вызначаны 222 установы агульнай сярэдняй адукацыі, у якіх плануецца поўнасцю абсталяваць кабінеты фізікі ў гэтым годзе. Як расказалі журналісту «Звязды» ў галоўным адукацыйным ведамстве, да 1 верасня будуць аснашчаны 22 кабінеты фізікі. Згодна з заключанымі дамовамі, на 13 жніўня ў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Глобус» было пастаўлена 71 найменне абсталявання: мэбля, інтэрактыўныя дошкі, тэлевізары, шматфункцыянальныя ўстройствы, вэб-камеры, мадэмы, маніторы, дэманстрацыйныя наборы па электрычнасці, стэнды, плакаты, тэлескопы. Дарэчы, тэлескопамі плануюць аснасціць усе 222 школы.

Завяршыць перааснашчэнне кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі плануецца да 2016 года. Згодна з Праграмай развіцця агульнай сярэдняй адукацыі, з 2014 па 2016 год на аснашчэнне кабінетаў фізікі, хіміі і біялогіі прадугледжана выдаткоўваць па 475,5 млрд рублёў штогод.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ТРЫМАЛЬНІКАМ КАРТАК МТБАНКА ЦЯПЕР ДАСТУПНЫЯ 600 БАНКАМАТАЎ

Учора да партнёрскай сеткі МТБанка далучыўся адзін з найбуйнейшых банкаў краіны — Белінвестбанк. Таму цяпер трымальнікі плацежных картак МТБанка змогуць дадаткова карыстацца больш чым 600 банкаматамі па ўсёй краіне, уключаючы машыны банкаў-партнёраў — Белінвестбанка і Белгазпрамбанка. Дарэчы, у банкаматах гэтых дзвюх устаноў усталёўваюцца аналагічныя ўмовы па выдачы наяўных тым, што дзейнічалі ў банкаматах «Пріорбанка». МТБанк рэкамендуе ў сувязі з гэтым сваім кліентам выкарыстоўваць банкаматы менавіта пазначаных устаноў на выгадных умовах. Акрамя таго, у банкаматах Пріорбанка з 1 верасня выдача наяўных будзе ажыццяўляцца на агульных умовах. МТБанк просіць улічыць апошняе пры планаванні сваіх аперацый з карткамі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## КВАТЭРНЫЯ ЗЛАДЗЕІ «ВЫЙШЛІ»... ПРАЗ АКНО

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку ГУУС Мінгарвыканкама разам з калегамі з Фрунзенскага РУУС сталіцы затрымалі серыйных кватэрных зладзеяў.**

Напачатку ў райаддзел міліцыі звярнуўся з заявай жыхар раёна, які заспеў у сваёй кватэры па вуліцы Панамарэнкі двух невядомых гасцей, што старанна абшуквалі яго жыллё. Злоўленыя ледзь не за руку, зладзеі паспрабавалі збегчы праз акно. Гэта пры тым, што кватэра, дзе яны вырашылі пажывіцца чужымі каштоўнасцямі, знаходзілася на трэцім паверсе. Пры падзенні адзін са зламыснікаў атрымаў траўму нагі. Гаспадар кватэры звярнуў на гэтую акалічнасць увагу аператыўнікаў. І ўжо праз два дні супрацоўнікі крымінальнага вышуку разам з байцамі спецпадраздзялення «Алмаз» затрымалі зладзеяў каля ўвахода ў паліклініку, куды яны звярнуліся па дапамогу. Абодва прыяцелі ўжо былі раней судзімыя, ужываюць наркотыкі. Праваахоўнікі не выключаюць, што затрыманыя могуць мець дачыненне да іншых аналагічных злачынстваў. Прынамсі, вядома як мінімум пра два такія выпадкі, але тады ўладальнікам была вернута іх маёмасць і яны ў міліцыю не звярталіся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ПРЫСВОІЛІ СРОДКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ ДОЛЕВАГА БУДАЎНІЦТВА

**У дачыненні да заснавальнікаў і службовых асоб будаўнічай кампаніі таварыства з абмежаванай адказнасцю «Антасам» Камітэт дзяржаўнай бяспекі завёў крымінальную справу.**

Паводле інфармацыі прэс-службы КДБ, папярэдняе даследаванне паказала, што з мая 2009 года па жнівень 2013-га дырэктар кампаніі, знаходзячыся ў змове з заснавальнікамі, прысвоіў грашовыя сродкі ўдзельнікаў долевага будаўніцтва. Грошы былі пералічаны на адрас ТАА «Антасам» на будаўніцтва кватэр у жылым комплексе «Самацветы» ва Фрунзенскім раёне сталіцы. Па месцы жыхарства падазроных асоб і ў офісах падкантрольных ім камерцыйных структур канфіскавана каля 18 кг золата ў злітках Нацбанка Беларусі. Устаноўлена таксама наяўнасць дарагіх аб'ектаў нерухомасці і транспартных сродкаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## З ТРАВЫ ПОЛЫМЯ ПЕРАКІНУЛАСЯ НА АДЗЕННЕ...

**У Салігорскім раёне шасцігадовы хлопчык атрымаў цяжкія апёкі, распальваючы вогнішча пры дапамозе бензіну.**

— Няшчасны выпадак адбыўся ў вёсцы Доўгае, дзе дзіця разам з 15-гадовым братам знаходзілася на падворку. У свой час хлопчык неаднойчы назіраў, як бацька пры дапамозе бензіну распальваў вогнішча, і паспрабаваў паўтарыць яго дзеянні, — паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Калі ён адкаркоўваў ёмістасць, гаручая вадкасць патрапіла на адзенне. Усё астатняе дзіця выліла на траву і запаліла. З травы полымя перакінулася на адзенне. Пры спробе самастойна затушыць агонь пацярпелы і атрымаў апёкі 40 працэнтаў цела. Дзіця шпіталізавалі ў рэанімацыйнае аддзяленне дзіцячай бальніцы ў крайне цяжкім стане.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «ПРЭМ'ЕР» НА 180 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

**Кантрабандысты амаль штодня хаваюць буйныя партыі тытуню пад вугалем, які вязуць у Латвію.**

У рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Бігосава-2» супрацоўнікамі Віцебскай мытні быў спынены грузавы чыгуначны састаў, які ехаў з Расіі ў Латвію. Падчас агляду двух паўвагонаў пад вугалем знайшлі 60 каробак з цыгарэтамі «Прэм'ер» беларускай вытворчасці з акцызнымі маркамі. 30 тысяч пачкаў на агульную суму 180 мільёнаў рублёў канфіскавалі.

## ЗГАРЭЎ АЎТАМАБІЛЬ

**У Віцебску ноччу згарэў аўтамабіль, які належыць рэспубліканскаму ўнітарнаму прадпрыемству «Белпошта».**

— Пажар адбыўся а пятай гадзіне ночы на вуліцы Петруся Броўкі, каля дома № 9. Агнём быў знішчаны аўтамабіль «ГАЗ-2705», 2006 года вырабу. Пры спробе самастойнага тушэння пажару кіроўца атрымаў апёкі рук, галавы 1-2 ступені, — паведаміла Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях. Мужчыну шпіталізавалі. Прычына пажару высвятляецца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## П'ЯНАЯ ТРАГЕДЫЯ

38-гадовая жыхарка Лунінецкага раёна і трое яе сабутэльнікаў забілі 34-гадовага мужчыну. Паводле версіі следства, уся кампанія спачатку гуляла ў доме жанчыны. Затым узнікла сварка, падчас якой дама і яе маладыя госці сталі збіваць 34-гадовага сужыцеля гаспадыні дома. Білі рукамі і нагамі, пакуль няшчасны не памёр. Цяпер усе ўдзельнікі застолля затрыманы. Двое з іх — 1989 года нараджэння — раней адбывалі пакаранне за розныя злачынствы.

**Яна СВЕТАВА.**

Печати, свидетельства о государственной регистрации, уставные документы ООО «МакКон-С», ООО «Пирамида плюс», ЧТУП «Тогак и К», ИЧПТУП «РадимичГруп», ИП Шинкевича Александра Сергеевича **считать недействительными в связи с их утерей.** УНП 191145300

■ Газета «Звязда» +www.doktora.by

# ЗВЯРТАЕМСЯ ДА НЕЎРОЛАГА

**На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by і чытачоў газеты «Звязда» адказала ўрач-неўролаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Юлія ВАРАНЬКО.**

***— 41 год. Чым можа быць выклікана аняменне кісці рукі? Была ў тэрапеўта, эндакрынолага. Здавала біяхімічны аналіз крыві, агульны аналіз крыві, аналіз мачы. Сказалі, што ўсё ў парадку.***

— Аняменне кісцяў можа быць сімптомам мноства захворванняў. Часцей за ўсё, гэта астэахандроз шыйнага аддзела пазваночніка, сіндром запясцевага канала, недахват вітаміну $B_{12}$, цукровы дыябет, рэўматоідны артрыт, хвароба Рэйна, эндакрынныя парушэнні і інш. Канчатковы дыягназ можна выставіць толькі пасля неўралагічнага агляду і некаторых дадатковых абследаванняў — рэнтгенаграфіі шыйнага аддзела пазваночніка ў некалькіх праекцыях або ядзерна-магнітна-рэзанансная і камп'ютарная тамаграфія, электранейраміяграфіі нервовых ствалоў перадплечча, аналіз крыві на цукар і інш.

***— 30 гадоў. Парэзаў руку шклом у трэцяй частцы перадплечча. Адразу пасля траўмы анямелі 1, 2 і 3 пальцы і частка далоні. Пасля 2 месяцаў лячэння аднаўленне адчувальнасці: 1 палец — 80%, 2 палец — 50%, 3 палец — 80%. Рухальныя функцыі: 1 палец — 30%, 2 палец — 70%, 3 палец — 100%. У месцы парэзу пры дотыку б'е токам у пальцы. Ультрагук сярэдняга нерва: верагодна частковае пашкоджанне сярэдняга нерва. ЭНМГ сярэдняга нерва: выражанае пашкоджанне сярэдняга нерва змешанага характару. Ці мэтазгодна рабіць аперацыю? Ці можа неўрома прайсці сама? Якім будзе аднаўленне пасля аперацыі? Ці не стане горш?***

— У вас добра аднавіліся рухальныя функцыі. Думаю, што можна працягнуць кансерватыўнае лячэнне, лячэбную фізкультуру, механатэрапію. З лекавых прэпаратаў вам павінны прызначыць нейрамідзін, тыяктацыд, вітаміны групы В і інш. У вашым выпадку, мяркую. аперацыя не паказана, паколькі любое аператыўнае ўмяшанне не выключае ўскладненняў.

***— 31 год. Апошнія паўтара месяца мяне турбуе пастаянны боль у шыйным аддзеле пазваночніка, у патыліцы, аняменне і боль у левай руцэ. Да якога спецыяліста трэба звярнуцца? Чым могуць быць выкліканы падобныя сімптомы?***

— Вам неабходна прыйсці на прыём да неўролага. Сімптомы, на якія вы ўказваеце, могуць быць звязаны з астэахандрозам шыйнага аддзела пазваночніка, наяўнасцю грыжы міжпазванковага дыска.

***— Пакутую ад бяссонніцы і галаўнога болю. Нібыта хочацца спаць, але заснуць цяжка, галаўны боль не моцны і прыкладна праз дзень. Ці можа гэта быць з-за штодзённага шуму, грукату, вібрацыі ў памяшканні?***

— Безумоўна, шум і вібрацыя могуць быць прычынай вашага стану. Аднак калі сімптомы ўзнікаюць і ў час адсутнасці шкодных навакольных умоў, неабходна звярнуцца да ўрача і абследавацца.

***— Майму хлопцу 26 гадоў. Калі ён сядзіць, то пастаянна дрыгае нагой. Ці норма гэта?***

— Хутчэй за ўсё, гэта проста шкодная звычка. Аднак канчатковы дыягназ можна паставіць толькі пасля агляду.

***— Дапамажыце расшыфраваць заключэнне пасля правядзення электраэнцэфалаграфіі: «Умераная дэзарганізацыя коркавага рытму без ачаговых змяненняў і параксізмальных формаў актыўнасці галаўнога мозга». Скаргаў не было і няма. Ці можна з такім дыягназам ісці на вадзіцельскую камісію ў 24-ю паліклініку г. Мінска?***

— Думаю, што можна. Не зразумела іншае. Для чаго выконвалася падобнае даследаванне, калі не было ніякіх скаргаў?

***— 23 гады. Неўратычнае заіканне, вельмі баліць галава, шум у вушах. Дэфармацыя галавы, з'яўляюцца залысіны па баках, але спадчыннай схільнасці няма. Падкажыце, што гэта?***

— Па той інфармацыі, якую вы пакінулі, вельмі цяжка выставіць нават папярэдні дыягназ. Звярніцеся, калі ласка, для пачатку да вашага ўчастковага тэрапеўта.

***— Мужчыну — 64 гады. Аблітэруючы атэрасклероз сасудаў ніжніх канечнасцяў. Рэканструктыўнае аператыўнае лячэнне не паказана ў сувязі з аклюзіяй дыстальнага аддзела сасудзістага русла. Лячэнне: дыпірыдамол, палакард, пентаксіфілін, натрыя хларыд. Рэкамендацыі: назіранне хірурга, пентаксіфілін 0,2 па 2 т. 3 разы ў дзень 3 месяцы. Кожныя паўгода — кропельніцы. На словах сказалі, што паражоныя дробныя сасуды. Язваў няма. Пастаянных боляў таксама. Ходзіць 100-150 метраў. Пасля нагрузак, часам ноччу нямее падэшва левай нагі. Якія прагнозы? Як адтэрмінаваць ампутацыю?***

— Пацыенты з такім дыягназам стаяць на дыспансерным уліку ў хірурга. Неабходна рэгулярна выконваць ультрагук сасудаў ніжніх канечнасцяў, раз у паўгода праходзіць прызначанае лячэнне, а таксама прытрымлівацца гіпахалестэрынавай, з малой колькасцю жывёльных тлушчаў, дыеты, пастаянна прымаць антыагрэганты (аспірын у дозе 75 мг) для прафілактыкі ўскладненняў (калі няма проціпаказанняў).

***— Патрэбна аперацыя 11-гадоваму хлопчыку — грамадзяніну Кіргізіі. Дыягназ: новаўтварэнне трэцяга жалудачка з кровазліццём у структуру памерам 32-35-37. Магнітна-рэзанансную тамаграфію выканалі ва Узбекістане. У Бішкеку і Алмаце няма спецыялістаў і апаратуры для такой аперацыі. Ці можна правесці яе ў Мінску? Падкажыце, куды звяртацца з такім пытаннем.***

— Вы можаце звярнуцца ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр неўралогіі і нейрахірургіі. Дзіцяці неабходна дапамога ўрача-нейрахірурга. Тэлефон рэгістратуры: 263 40 39, платных паслуг: 267 12 40.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# СПАС — УСЯМУ ЧАС

**Праваслаўныя вернікі адзначалі адно з дванаццаці найважнейшых хрысціянскіх свят — Праабражэнне Гасподняе і Спас Ісуса Хрыста. У народзе гэтае свята завецца Яблычным Спасам. Ва ўсіх храмах Беларусі асвячалі плады новага ўраджаю. Сярод пладовых дрэў яблыня асабліва ўшанавана ва ўсходніх славян: яна не толькі сімвалізуе жыццё, вечнасць і неўміручасць, але, як лічыцца, дае здароўе. З самай раніцы каля Свята-Духавага кафедральнага сабора сабраліся тысячы вернікаў, каб адсвяткаваць Другі Спас.**

**Згодна з народнымі прыкметамі і павер'ямі, па надвор'і на Яблычны спас прагназавалі, якім будзе студзень. Лічыцца, калі стаіць у гэты дзень жара, то і снегу будзе мала. А калі суха — то і восень будзе без дажджоў.**

**Марына БЕГУНКОВА.**
**Фота аўтара.**







■ Шляхамі першай сусветнай

# НЕБА І ЗЯМЛЯ АВЯНІРА КАНСЦЕНЧЫКА

**Сапраўдным упрыгажэннем праваслаўных могілак у Стоўбцах з'яўляецца двухметровы помнік цёмна-чырвонага мармуру, увянчаны крыжам. На пастаменце высечаны евангельскія словы: «Придиите ко мне вси труждающиися и обремененнии, и аз упокою вы»(Мф.11.28), а пад імі чытаецца: «Авянір Маркавіч Кансценчык, псаломшчык Стаўпецкай царквы, палкоўнік рускай арміі, кавалер ордэна св. Георгія, капітан паветранага карабля «Ілья Мурамец». Сканаў 29.XII.1935 г. з роду 46 гадоў».**

Тут пахаваны герой-лётчык, наш суайчыннік. Чаму мы цытуем надпіс на яго магіле? Справа ў тым, што ў шэрагу выданняў пра яго (у самых, здавалася б, аўтарытэтных, нават энцыклапедычных) ёсць мноства недакладнасцяў. Пачынаючы з прозвішча: прыводзячы дакладную фатаграфію помніка, тым не менш перадаюць яго як «Касценчык», незразумелым чынам страчваючы літару «н». Мы пастараемся, наколькі гэта магчыма, удакладніць некаторыя акалічнасці біяграфіі Авяніра Маркавіча.

Нарадзіўся ён 2 жніўня 1889 года ў Гродне. Аб яго паходжанні пішуць па-рознаму: «у сям'і служачага», «з беларускіх сялян», «у сям'і беларусаў». А на самой справе? У «Даведачнай кніжцы Гродзенскай епархіі на 1905 год» знаходзім дыякана на вакансіі псаломшчыка Марка Іванавіча Кансценчыка, які служыў у гарадскім кафедральным саборы святой Сафіі, Прамудрасці Божай і быў рукапаложаны ў духоўны сан у 1987 годзе (гэта значыць, праз 8 гадоў пасля нараджэння сына Авяніра). Ды і ці стаў бы далёкі ад царквы чалавек прысвойваць сваім сынам выключна царкоўныя імёны — Авянір, Апалінарый?

Такім чынам, правільны адказ — «нарадзіўся ў сям'і свяшчэннаслужыцеля».

Цалкам натуральна, бацька хацеў, каб сыны прынялі свяшчэнніцкі сан (так, дарэчы, і адбылося з яго сынам Апалінарыем).

Таму Авянір заканчвае ў 1908 годзе 4 класы Літоўскай духоўнай семінарыі ў Вільні, але, заклаўшы першы круты віраж у сваім жыцці, выбірае пасля кар'еру ваеннага. Многія семінарысты па розных прычынах выбіралі цывільнае поле дзейнасці, але каб вось так, з семінарскай лавы і ў афіцэры? «Сапраўды крута», — скажа малады чытач.

6 жніўня 1910 года Кансценчык выпушчаны з Віленскага пяхотнага вучылішча ў званні падпаручніка. У 1910—1913 гг. служыць у гэтым званні ў 33-м пяхотным Ялецкім палку (з 15 лістапада 1913 г. — паручнік). У 1914 г. камандзіраваны ў ваенную авіяцыйную школу (Гатчына), пасля заканчэння якой назначаецца малодшым афіцэрам Брэст-Літоўскага крапаснога авіяцыйнага атрада.

Нагадаем, што ў гэты час авіяцыя (і ваенная, у прыватнасці) развівалася ў Расіі надзвычай актыўна. Вельмі таленавіты канструктар І.І. Сікорскі стварыў цяжкі чатырохматорны біплан «Ілья Мурамец», які працяглы час не меў аналагаў і стаў першым у свеце пасажырскім самалётам. Упершыню ў гісторыі авіяцыі самалёт аснашчаны камфартабельным салонам, спальнымі пакоямі, ваннай і прыбіральняй; тут ёсць ацяпленне і электрычнае асвятленне. За кароткі прамежак часу «Ілья Мурамец» ставіць цэлы шэраг рэкордаў грузападымальнасці, колькасці пасажыраў, часу і максімальнай вышыні палёту.

З пачаткам Першай сусветнай вайны ўсе пабудаваныя ў той час самалёты «Ілья Мурамец» перадаюцца ў Імператарскі ваенна-паветраны флот, і Мікалай II зацвярджае пастанову ваеннага савета аб стварэнні эскадры паветраных караблёў «Ілья Мурамец» — першага ў свеце злучэння цяжкіх бамбардзіроўшчыкаў.

22 верасня 1914 г. у эскадру пераводзіцца лётчык Авянір Кансценчык, дзе з 13 снежня выконвае абавязкі камандзіра паветранага карабля «Ілья Мурамец».

Баявыя вылеты, баявыя будні. Надыходзіць час подзвігу. 13 красавіка 1916 года экіпаж А.М. Кансценчыка атрымлівае загад атакаваць важны чыгуначны вузел Даўдзевас паблізу ад Фрыдрыхштата. Карабель быў сустрэты ўраганным агнём зенітных батарэй, тым не менш яго камандзір смела знізіўся, каб мець магчымасць больш дакладна прыцэліцца, зрабіў над станцыяй правільны круг і скінуў 13 бомбаў. Пападанні, як паказалі пасля фотаздымкі, былі выдатнымі. Пры замыканні першага палётнага круга адзін з варожых снарадаў узарваўся пад самым корпусам карабля. Другі — спераду яго. Цяжка параненыі кантужаны, Кансценчык, які сыходзіў крывёй, знайшоў у сабе сілы, каб зрабіць над станцыяй яшчэ адзін круг і скінуць 7 бомбаў. У гэты час — новы снарад і чарговыя пашкоджанні. Кансценчык паранены шрапнеллю ў грудзі навылёт. Упаўшы з пілоцкага крэсла, ён пацягнуў штурвал на сябе, прымусіўшы карабель падняцца ўверх. «Мурамец» страціў хуткасць, а пасля стаў крута пікіраваць. Немцы назіралі за яго падзеннем, але радасць іх аказалася дачаснай. Памочнік камандзіра, паручнік В.Ф. Янковіус не разгубіўся, змог дабрацца да пілоцкага крэсла і ўзяў кіраванне на сябе. З вялікай цяжкасцю ён стабілізаваў вялізны самалёт на вышыні 1500 м. Гэта была нялёгкая задача. Тры рухавікі, нягледзячы на пападанні, працавалі нармальна, чацвёрты быў пашкоджаны, а яго лопасць — разбіта ў шчэпкі.

Прыкладна праз гадзіну Янковіус пасадзіў пашкоджаны карабель на свой аэрадром. Пры пасадцы правае крыло з трэскам абвісла, закранула зямлю і развярнула карабель. Як аказалася, адным з пападанняў быў амаль перабіты пярэдні ланжэрон правага крыла, а ўсяго ў караблі налічылі да 70 прабоін.

У хуткім часе сталі вядомыя і вынікі налёту. Апошняя серыя бомб, скінутая артылерыйскім афіцэрам Шнеўрам, накрыла цягнік з боепрыпасамі, станцыя была амаль цалкам разбурана.

За гэты баявы вылет А.М. Кансценчык быў узнагароджаны ордэнам св. Георгія 4-й ступені. Атрымалі ўзнагароды і астатнія члены экіпажа. Тут жа адзначым, што да гэтага часу Кансценчык ужо меў ордэны св. Станіслава 3-й ступені з мячамі і бантам і 2-й ступені з мячамі, св. Ганны 3-й ступені з мячамі і бантам і 2-й ступені з мячамі, св. Уладзіміра 4-й ступені з мячамі і бантам. Подзвіг лётчыка знайшоў сваё адлюстраванне ў шэрагу публікацый тагачасных газет і часопісаў Расіі.

Параненага героя даставілі ў шпіталь горада Рыгі. Пасля доўгага выздараўлення ён ужо не змог лятаць, але застаўся ў наземнай службе эскадры. 6 жніўня 1917 года атрымаў званне штабс-капітана.

Новае выпрабаванне, новы віраж лёсу: кастрычніцкі пераварот і грамадзянская вайна падзялілі лётчыкаў на два непрымірымыя лагеры. Кансценчык застаецца верным прысязе, служыць у Добраўольніцкай арміі, а пасля — ва ўзброеных сілах поўдня Расіі. Заканчвае вайну палкоўнікам (інакш нічым не патлумачыш надпіс на яго помніку). Пасля эвакуацыі з Крыма эмігрыруе ў Югаславію, пасля вяртаецца на Радзіму — у Заходнюю Беларусь.

Некаторы час ён жыў у Маладзечне, а з 1933 года — у Стоўбцах, дзе ўладкаваўся на службу псаломшчыкам у мясцовую царкву. Акрамя гэтага асноўнага свайго абавязку, Авянір Маркавіч выкладаў у вясковых школах Закон Божы.

Усё вярнулася на кругі свае. Вось дзе і спатрэбіліся 4 класы семінарыі. Дзіўная справа: узлёт, геройскія палёты і пасадка на роднай зямлі. Праваслаўны семінарыст, які стаў афіцэрам і ваенным лётчыкам, завяршае свой зямны шлях псаломшчыкам і выкладчыкам Закона Божага беларускім дзецям.

Паводле слоў прыхаджан, Авянір Маркавіч карыстаўся сярод іх вялікім аўтарытэтам, быў сціплым і ўважлівым да людзей, вельмі любіў дзяцей, адрозніваўся высокай культурай і шырокай адукаванасцю, меў абсалютны слых і цудоўны голас, іграў на многіх музычных інструментах.

Што сказаць пра смерць нашага героя?

У канцы 1935 года Авянір Маркавіч захварэў на сыпны тыф і памёр 29 снежня. Магчыма, што на яго смерць паўплывалі і старыя баявыя раны. Аднак, па сведчанні відавочцаў, ніводная пахавальная працэсія ў Стоўбцах не збірала столькі народу.

Мармуровы помнік на магіле Авяніра Кансценчыка быў усталяваны стараннямі яго брата, свяшчэнніка Апалінарыя, які да 1939 года вельмі часта прыязджаў сюды са Смаргоні (таму надпіс на помніку і заслугоўвае поўнага даверу).

...Непрыкметна набліжаецца і стагадовы юбілей пачатку Першай сусветнай вайны. Да такой падзеі можна прымеркаваць шэраг сціплых, але годных мерапрыемстваў. Аддаючы даніну памяці Авяніру Маркавічу Кансценчыку, вельмі пажадана назваць у яго гонар вуліцы як у Стоўбцах, так і на яго радзіме, у Гродне, усталяваць адпаведныя мемарыяльныя дошкі (тым больш, што такая прапанова ўжо агучвалася ў СМІ).

Наш герой заслужыў гэта і перад Богам, і перад людзьмі.

**Павел БАЯНКОЎ**

■ Новы рытуал

# КУРСАНТАМ-ПЕРШАКУРСНІКАМ УРУЧЫЛІ ПАГОНЫ

**Спякотная жнівеньская раніца. Звычайная для курсантаў Ваеннай акадэміі сёлетняга набору. Каманда «пад'ём» — і дзень пачаўся. І ў той жа час не падобная да ўсіх тых, якія былі на працягу апошніх трох тыдняў. Замест ранішняй фізічнай падрыхтоўкі — урачыстая цырымонія атрымання пагонаў і першая клятва на вернасць Радзіме.**

— Такі рытуал, як урачыстае ўручэнне пагонаў першакурснікам, у галоўнай ваеннай ВНУ краіны праводзіцца ўпершыню, — паведаміў начальнік Ваеннай акадэміі генерал-маёр Сяргей БОБРЫКАЎ. — Гэта выклікана тым, што нашы будучыя абаронцы Айчыны павінны з першых крокаў вайсковай службы прызвычайвацца да тых традыцый, якія спакон веку існавалі ў арміі. Сённяшняе мерапрыемства згуртоўвае людзей, дае перспектывы на добрае патрыятычнае выхаванне.

Каб атрымаць запаветныя нашыўкі на ваенную форму, курсанты амаль месяц займаліся агульнавайсковай падрыхтоўкай. Паспелі ўжо зведаць некаторыя цяжкасці і абмежаванні вайсковай службы. У выніку пагоны атрымалі 356 юнакоў. Хутка ўсе яны сядуць за вучэбныя парты. 43 чалавекі спасцігаць ваенную навуку будуць у ВНУ Расійскай Федэрацыі. Трое будуць навучацца ў інтарэсах Узброеных Сіл у Акадэміі МУС.

— Каб паступіць у Расійскую Федэрацыю на факультэт спецыяльнай разведкі, давялося шмат вучыцца і займацца фізічнай падрыхтоўкай, — расказаў курсант Новасібірскага вышэйшага каманднага вучылішча Максім Лямешка. — Асабістае дасягненне — 2 скачкі з парашутам. Мне цікава будзе вучыцца там хаця б з-за таго, што ў мяне з'явіцца магчымасць пазнаёміцца з сучаснай ваеннай тэхнікай і з узбраеннем расійскай арміі. Пра гэта я марыў яшчэ тады, калі вучыўся ў Мінскім ваенным сувораўскім вучылішчы. Родныя мяне ў гэтым падтрымліваюць. Да таго ж мае бацька і брат — ваенныя.



Пагоны — сімвал гонару: курсанты сёлетняга набору пакляліся быць годнымі абаронцамі Айчыны.

**Нашы будучыя абаронцы Айчыны павінны з першых крокаў вайсковай службы прызвычайвацца да тых традыцый, якія спакон веку існавалі ў арміі.**

А Аляксандр Бухта пачне спасцігаць ваенную навуку на агульнавайсковым факультэце Ваеннай акадэміі па мотастралковай спецыяльнасці. Юнак жартуе, што гэта добрая заяўка ў камандзіры: якраз такія спецыялісты складаюць большасць каманднага складу Узброеных Сіл краіны. І ў яго на добрую кар'еру ёсць усе шанцы. Аляксандр працягвае ваенную дынастыю сваёй сям'і: дзядуля, бацька, дзядзька і брат у розны час прысягалі на вернасць Айчыне. Таму годна праходзіць службу для юнака — задача № 1, бо і родныя папярэдзілі: «Не падвядзі!»

У той жа дзень на тэрыторыі акадэміі адбылося і ўрачыстае адкрыццё спартыўнага комплексу. Ужо сёння штодзённую фізічную падрыхтоўку курсанты будуць адпрацоўваць на 2 валейбольных і баскетбольных пляцоўках, а таксама на полі для гульні ў міні-футбол.

— Паколькі ў нашай краіне шмат увагі надаецца спорту, мы прынялі рашэнне стварыць спартыўны комплекс, — дабавіў Сяргей Бобрыкаў. — Раней тут была пустка. Цяпер — спартыўны горад. Сёлета наша каманда па валейболе будзе прымаць удзел у першай лізе. Спадзяёмся, што на гэтай пляцоўцы з часам вырастуць новыя алімпійскія чэмпіёны, чэмпіёны свету і проста загартуюцца моцныя і здаровыя юнакі.

Чым не падарунак да Дня ведаў?

**Вераніка КАНЮТА. Фота аўтара**


Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Сярод падпісчыкаў 10.10.2013 г. будуць разыграны 7 бесшнуравых тэлефонных апаратаў і суперпрыз — тэлевізар LG. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 20.10.2013 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 31.12.2013 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.

Правілы рэкламнай гульні «Падпішыся на “Звязду”» чытайце ў газеце «Звязда» за 16.08.13 г.

**Тэрмін правядзення гульні — з 20.08.13 па 31.12.13.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2211 ад 25.07.13, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**1 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
____________________ на IV кв. або 2-е паўг. 2013 года

Хатні адрас і тэлефон [ ] ____________________
(індэкс)

Удачы ў розыгрышы!

■ Зона некурэння

# ХТО ПАМЯНЯЕ ЦЫГАРЭТУ НА ЦУКЕРКУ?

**У Бярэзінскім раёне знайшлося 100 ахвотных. Там завяршылася акцыя «Аграгарадок — зона цвярозасці і некурэння». Удзельнічала ў ёй каля 500 чалавек.**


Самадзейныя артысты супраць шкодных звычак.
Фота Алены ГРОМАВАЙ.

Яшчэ Дэмасфен казаў, што змагацца з чалавечымі заганамі трэба ўсімі даступнымі сродкамі і ў першую чаргу словам. Сапраўды так, яркае слова — гэта і баец, і прапагандыст, і агітатар, і сродак пераканання. А хто добра валодае словам? Бясспрэчна, работнікі культуры, бібліятэк. Менавіта яны звярнуліся ў Бярэзінскі райвыканкам з прапановай правесці мабільную акцыю па прапагандзе здаровага ладу жыцця.

— У раёне 10 аграгарадкоў. Наш агітцягнік выйшаў на маршрут 17 мая, першым наведалі аграгарадок «Паплавы», — распавяла загадчыца аддзела маркетынгу Бярэзінскай раённай бібліятэкі, старшыня раённага Савета жанчын, аўтар і вядучая праекта Тамара Круталевіч. — Аграгарадкі былі выбраны менавіта таму, што яны з'яўляюцца флагманамі сацыяльна-культурнага развіцця сельскай мясцовасці. Сваёй акцыяй мы мелі на мэце падняць іх статус, паказаць асаблівасці і непаўторнасць, а таксама сфарміраваць грамадскую думку, атмасферу нецярпімасці да цыгарэтнага дыму і хмельных традыцый з ідэяй абвяшчэння кожнага аграгарадка зонай цвярозасці і некурэння.

Кампанія прадугледжвала шматлікія мерапрыемствы для людзей розных узростаў, прафесій, сацыяльнага статусу. Напрыклад, «У радасны дзень вяселля ні кроплі спіртнога» (для маладажонаў), «Падымі гіру пяць разоў і атрымай прыз», «Самадзейныя артысты супраць шкодных звычак», «Ушанаванне землякоў — прыхільнікаў руху «Аграгарадок — зона цвярозасці і некурэння», «Залаты фонд аграгарадка», «Памяняй цыгарэту на цукерку» і шмат іншых. Безумоўна, яны праходзілі з выкарыстаннем разнастайных прыёмаў, што выклікалі моцныя эмоцыі, абвостранае ўсведамленне і вобразнае ўспрыманне інфармацыі. Па колькасці цукерак, што разышліся, арганізатары падлічылі: у акцыі ўдзельнічала звыш 100 чалавек.

Асноўнае дзеянне адбывалася ў дамах культуры аграгарадкоў. У прыватнасці, тэатр аднаго акцёра прадстаўляў нявыдуманыя гісторыі пра трагедыі людзей, якіх загубіла «зладзейка з наклейкай». Перад жыхарамі выступалі старасты, старшыні сельскіх Саветаў з заклікам пачынаць з сябе, сваёй сям'і, каб пераўтварыць аграгарадок у зону цвярозасці. Акцэнт рабіўся на ўшанаванне людзей, сем'яў, якія не сябруюць з алкаголем і цыгарэтай, маюць карысны для сябе занятак. Падчас прэзентацыі яны расказвалі, адкуль пайшла гэтая традыцыя — ад бацькоў, дзядоў. Адзін з жыхароў, які доўгі час курыў, пры пераездзе на новае месца жыхарства развітаўся са шкоднай звычкай. «Як жа я з цыгарэтай у зубах павяду па вуліцы свайго сына ў школу?» — заявіў ён. За ўзор бралі і старажылаў, якія за свой сталы век не выкурылі ні адной цыгарэты, не выпілі чаркі гарэлкі. Былому ўрачу Марыі Гаўрылаўне Кавалёвай 92 гады. Пра сакрэт свайго даўгалецця яна кажа так: «Няма хворых, ёсць гультаі». І раіць пераняць гэты дэвіз маладому спецыялісту Пагосцкай участковай бальніцы Юрыю Курачу. Праўда, Юрый Георгіевіч не курыць сам і нават дапамог развітацца з заганай двум пацыентам. Анатолю Сцяпанавічу Стрыгельскаму 87 гадоў. Дваццаць гадоў таму кінуў курыць.

У якасці прыкладу прыводзіліся прозвішчы кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый, органаў мясцовага самакіравання, школьных устаноў, чыя пазіцыя паспрыяла павышэнню прэстыжу родных мясцін. Цудоўна, што сярод тых, хто стаіць душою за цвярозасць і некурэнне, знайшлося шмат педагогаў. Гучалі імёны механізатараў, якія вядуць прыстойны лад жыцця. Механізатар — самая запатрабаваная спецыяльнасць на вёсцы. Яго называць «валадаром поля», «сябрам жаўрука». У аграгарадках «Багушэвічы», «Лешніца», «Пагосцкі» сярод механізатараў шмат хто не захапляецца выпіўкай і курэннем. Напрыклад, у Сяргея Корыка два цудоўныя сыны: малодшы вучыцца ў школе, а старэйшы закончыў авіяцыйны каледж. Як лічыць Сяргей Дадонаў, быць перадавіком яму дазваляе ў тым ліку і адсутнасць перакураў.

— Мы імкнуліся давесці да кожнага: аграгарадок — гэта не толькі геаграфічная тэрыторыя. Людзей, што тут пражываюць, аб'ядноўвае любоў да роднага краю, агульная праца на карысць грамадства, традыцыі і звычкі іх продкаў. І, бясспрэчна, рабілі ўпор на нейкую адметнасць кожнага з іх. Напрыклад, у аграгарадку «Багушэвічы» выпускнікі мясцовай школы 1981 года засталіся ў калгасе ўсім класам. Так утварылася Маладзёжная вуліца. І сярод іх няма выпівох. У аграгарадку «Лешніца» таксама шмат маладых сем'яў жыве на вуліцах Маладзёжнай і Паркавай. У кожнага дагледжаны падворак, каля дома мноства кветак і зяляніны, падсобная гаспадарка. Тут таксама не сябруюць з гарэлкай і тытунём, а значыць, і з лянотай. У аграгарадку «Сяліба» пражывае аж сем нацыянальнасцяў. Жывуць у згодзе і міры, бо не ўжываюць спіртнога, — адзначае Тамара Круталевіч.

А многія не пабаяліся прызнацца перад землякамі, што злоўжывалі алкаголем ці курэннем, але знайшлі ў сабе сілу волі завязаць са шкоднымі звычкамі. Такім уручалі самаробны ордэн « За цвярозасць. За сілу волі». І асаблівы наказ давалі маладажонам засцерагацца «ад зладзейкі з наклейкай». Ад гэтага залежыць іх далейшы дабрабыт, здароўе іх дзяцей.

— Вядома, мы не ідэалісты, разумеем, што цяжка адначасна выправіць чалавека, які злоўжываў гарэлкай і тытунём гадамі. Але нават калі некалькі нашых грамадзян задумаюцца над сваімі паводзінамі і перастануць піць, то нашы намаганні патрачаны не дарэмна, — гаворыць Тамара Круталевіч.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

■ Спорт-тайм

# АЗАРАНКА ЗНОЎ ЛЕПШАЯ ЗА УІЛЬЯМС!

**Вікторыя Азаранка перарывае 14-матчавую пераможную серыю Серэны Уільямс, БАТЭ нечакана саступае «Гомелю», а хакейнае «Дынама» церпіць няўдачу на хатнім турніры памяці Руслана Салея. «Звязда» падводзіць спартыўныя вынікі за мінулы тыдзень.**

**1. Вікторыя Азаранка паклала ў сваю скарбонку яшчэ адну перамогу ў прадстаўнічых тэнісных спаборніцтвах.** Гэтым разам наша тэнісная прыма выдатна згуляла ў фінале турніру, што адбыўся ў амерыканскім Цынцынаці. Пра значнасць гэтага мерапрыемства сведчыць і прызавы фонд, які перавысіў 2 мільёны долараў. Цікава, што аспрэчваць перамогу беларусцы прыйшлося з Серэнай Уільямс — напэўна, з самым нязручным для сябе апанентам. Дагэтуль яны сустракаліся 14 разоў і толькі двойчы перамога была на баку мінчанкі. На шчасце, гэты паядынак не стаў працягам не вельмі добрай для Вікторыі гісторыі супрацьстаяння. 2:6, 6:2, 7:6 (8:6) — лік, які стаў пераможным для Азаранкі ў чарговым матчы з Серэнай Уільямс. «У гэтай вялікай бітве ніхто не хацеў саступаць, — прызналася пасля цяжкага паядынку шчаслівая Вікторыя. — Але гэта была чыстая барацьба. Я сапраўды шчаслівая». У рэйтынгу жаночай тэніснай асацыяцыі па-ранейшаму лідзіруе Серэна Уільямс, другую пазіцыю займае Азаранка, а на трэцім месцы — расіянка Марыя Шарапава.

*Па корце ты натхнёна, спрытна*
*Бяжыш — і коска залатая*
*Так непаўторна-каларытна*
*Па-над плячыма ўзлятае...*

*(з верша Васіля Жуковіча «З яскравай новай перамогай!», прысвечанага чарговаму поспеху Вікторыі Азаранкі).*

**2. Бурляць эмоцыі і на футбольных палях Беларусі.** Да завяршэння другога «кола» айчыннага першынства застаецца толькі адзін тур. Пасля другога адрэзка клубы падзеляцца на дзве шасцёркі, у адной з якіх будзе весціся барацьба за медалі, а ў другой — за выжыванне. І пакуль толькі некалькі клубаў забяспечылі сабе месца ў групе мацнейшых — «Шахцёр», БАТЭ, мінскае «Дынама» і «Гомель». Між іншым, менавіта «Гомель» стаў галоўнай сенсацыяй 21-га тура чэмпіянату краіны па футболе. Падапечныя Аляксея Мяркулава на сваім полі ў другі раз у гэтым сезоне перамаглі барысаўскі БАТЭ — 3:2. Матч атрымаўся відовішчным, багатым на вострыя моманты і сабраў на трыбунах гомельскага стадыёна 7600 гледачоў —рэкордная колькасць балельшчыкаў у сёлетнім першынстве. Іншыя сустрэчы прынеслі наступныя вынікі: «Тарпеда» — «Нёман» 1:1, «Дынама» (Мінск) — «Белшына» 2:0, «Славія» — «Дынама» (Брэст) 1:1, «Нафтан» — «Дняпро» — 2:1, «Шахцёр» — «Мінск» 4:1. За першае месца моцна трымаецца «Шахцёр» (на рахунку гарнякоў 49 балаў), у БАТЭ 45 балаў, а ў мінскага «Дынама» — на 14 менш.


Момант матча «Тарпеда» — «Нёман».
Фота Андрэя ЯРОЦКАГА.

**3. У хатнім турніры па хакеі памяці Руслана Салея сталічнае «Дынама» фінішыравала на трэцім месцы.** Падапечныя Аляксандра Андрыеўскага двойчы саступілі па булітах хабараўскаму «Амуру» (1:2) і маскоўскаму «Спартаку» (1:5) і перамаглі гродненскі «Нёман» 3:1. А вікторыю святкавалі хабараўчане, якія ў вырашальным матчы перайгралі «Спартак» — 3:2.

**4. Сёлетняе першынство свету па лёгкай атлетыцы не парадавала айчынных спартсменаў і балельшчыкаў бляскам медалёў.** Лепшым вынікам для беларусаў так і засталося 4-е месца Вольгі Сударавай у скачках у даўжыню, пра што мы ўжо пісалі тыдзень таму. У агульным заліку лепшай была зборная Расіі. На рахунку нашых усходніх суседзяў 7 залатых, 4 сярэбраныя і 6 бронзавых узнагарод.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

# ДЭБЮТАНТЫ ВЕРХАВОДЗЯЦЬ!

## Мужчынская зборная Беларусі па баскетболе выйшла ў плэй-оф кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы-2015

**Перад пачаткам вырашальнага паядынку ў групе D мала хто асмеліўся б назваць фаварытам сустрэчы беларускую каманду. Больш упэўнена ў гэтай ролі выглядала зборная Славакіі, якая ўжо мела ў сваім актыве перамогу над падапечнымі Руслана Байдакова. У славацкай Левіцы нашы хлопцы прайгралі гаспадарам. Пасля фінальнага матча кваліфікацыі галоўны трэнер беларускай дружыны Руслан Байдакоў прызнаўся, што той пройгрыш «стаў сапраўднай пстрычкай па носе, якая прымусіла мабілізавацца перад наступнай сустрэчай з венграмі».**

Напэўна, вопыт сустрэч з учэпістымі мадзьярамі дапамог беларусам цалкам раскрыцца. Тое, што падапечныя Руслана Байдакова падчас турніру значна прыбавілі ў абароне, стала відавочна адразу на старце матча са славакамі. Асабліва ўдала нашы хлопцы дзейнічалі на падборы. Тут варта адзначыць і якасную гульню Аляксандра Кудраўцава, які быццам часова змяніў амплуа, выдатна спраўляючыся з роляй асноўнага разыгрываючага. Асабліва запомнілася дальняя перадача на Віталя Лютыча, які выканаў кідок з-пад кальца. Але яшчэ больш эфектнымі ў форварда зборнай атрымліваліся трохачковыя кідкі з-за дугі. Гэты ж элемент удала праходзіў у ініцыятыўнага Аляксандра Пустагвара. У пэўны момант здалося, што Лютыч і Пустагвар спаборнічаюць, хто больш «накідае» эфектных трохачковых.

Але ўжо пасля фінальнай сірэны Віталь Лютыч прызнаўся карэспандэнту «Звязды», што не ўсім задаволены ў сваіх дзеяннях: «Было мала праходаў. Я люблю гуляць пад кальцом, але сёння чамусьці лепш атрымліваліся трохачковыя кідкі. Тым не менш прыемна, што мае ачкі дапамаглі камандзе».

У трэцім перыядзе беларусы канчаткова разбурылі гульню сапернікаў. У славакаў ужо не атрымлівалася амаль нічога: дрэнная рэалізацыя кідкоў, нават штрафных, недарэчныя страты мяча, спантанныя рашэнні, выдаленні за неспартыўныя фалы. Адрыў нашых хлопцаў складаў больш за трыццаць ачкоў! І тут Байдакоў вырашыў выпусціць на паркет фактычна другі склад каманды, даў пагуляць маладому «дэсанту». На пляцоўцы верхаводзілі Дзмітрый Акуліч, Уладзімір Крысевіч, Аляксей Трасцінецкі. Дарэчы, апошні стаў самым рэзультатыўным гульцом, паспеўшы фактычна за адзін перыяд «накідаць» 21 ачко. Апошнюю дзесяціхвілінку беларусы адыгралі ўнічыю, аднак гэта не пашкодзіла адсвяткаваць выніковую перамогу з разгромным лікам 114:73.




Пасля заканчэння сустрэчы Руслан Байдакоў падсумаваў вынікі выступлення сваіх падапечных: «Магчыма, не так добра дзейнічалі мы, як дрэнна згулялі сапернікі. Зборная Славакіі дома і зборная Славакіі ў гасцях — гэта дзве розныя каманды. Безумоўна, прыемна, што хлопцы прадэманстравалі пераможны настрой і сапраўдны камандны дух. Гэта вельмі важна ва ўзаемадзеянні маладых гульцоў і вопытных баскетбалістаў. Да канца стараўся трымаць хлопцаў у тонусе, эмацыянальна падказваў, каб дэбютанты зборнай не расслабляліся і не дазвалялі сабе піжонства. Мы толькі што з першага месца выйшлі ў паўфінал, а ўжо праз некалькі дзён трэба гуляць з эстонцамі. Нельга расслабляцца! Прыбалты — вельмі вопытная каманда, якая пастаянна ўзмацняецца. Так што будзе цяжка».

Дарэчы, хатні матч супраць зборнай Эстоніі беларускія баскетбалісты правядуць 22 жніўня ў Магілёве. Прыходзьце падтрымаць сваю каманду!

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ**

■ Рэпарцёр накіраваўся ў рэйд

# КАЛЯ ВАКЗАЛА З УЧАСТКОВЫМ

**Мінскі чыгуначны вакзал — гэта гіганцкая перавалачная база, праз якую штодня праходзяць дзясяткі тысяч пасажыраў. Сустракаюцца тут яшчэ і вакзальныя прайдзісветы ды махляры, ці людзі без пэўнага месца жыхарства. Калі ўлетку яны любяць «гастраляваць», то ў дрэннае надвор'е перабіраюцца ў вядомыя толькі ім памяшканні, дзе чакаюць іх сталыя сабутэльнікі. Карэспандэнты «Звязды» адправіліся ў рэйд па прывакзальных мясцінах разам з участковым інспектарам.**

### «Зноўку п'юць тут, і б'юцца, і плачуць...»

Сталічны двор у межах вуліц Свярдлова-Ульянаўскай-Бабруйскай-Кірава — адзін з тых нямногіх, дзе людзям у пагонах патрэбна праходзіць кожныя дзесяць-пятнаццаць хвілін. У двары знаходзіцца грамадскі пункт аховы правапарадку № 50, куды міліцыянеры на нашых вачах вядуць чарговага злоўленага зламысніка.

— Мяне прызначылі ўчастковым інспектарам сюды летась у маі. Дагэтуль працавала ў патрульна-паставой службе, — гаворыць участковы інспектар грамадскага пункта аховы парадку №50 Кастрычніцкага РУУС Наталля Кісялевіч. — Раён чыгуначнага вакзала — бадай што самы «напружаны» для сталічных праваахоўнікаў. Чаго тут толькі ні здараецца: і кішэні чысцяць, і мабільнікі спрабуюць прадаваць з рук, і проста падманваюць неспрактыкаваных людзей. Гэта сапраўдны «кландайк» для аматараў розных дэтэктыўных прыгод...

### «Там за сталом мужчыны годнасць прапіваюць...»

А яшчэ тутэйшыя кватэрыператвараюцца ў прыстанішча для прывакзальных алкаголікаў. Гаспадары такіх кватэр-прытонаў, як правіла, маюць багаты крымінальны стаж. Многія з іх забыліся, калі хадзілі ў апошні раз на пастаянную працу, калі мелі выпадковы заробак. Афіцыйна яны грошай не зарабляюць і таму заплаціць выпісаны за парушэнне грамадскага парадку штраф у некалькі базавых не могуць. Да таго ж ні яны, ні іх госці-выпівохі зачастую не скупяцца на розныя зневажанні ў адрас людзей з пагонамі. Могуць нават і ў бойку палезці. Раз-пораз падзеі ў прытоне кваліфікуюцца як дробнае хуліганства. У любым выпадку незадачлівых гаспадароў затрымліваюць і раніцай вядуць у суд, дзе часцей за ўсё ім прызначаюць прафілактычны арышт на тэрмін ад двух да пятнаццаці сутак. Пасля трох такіх парушэнняў выпівоха рызыкуе адправіцца ў лячэбна-працоўны прафілакторый. Аднак страшыць гэта далёка не ўсіх. Большасць так і працягвае хадзіць па замкнёным коле «прытон — міліцыя — суды — ЛПП — прытон». Ёсць у прывакзальным мікрараёне нават рэкардсмены, якія пабывалі ў прафілакторыі тры-чатыры разы...

— На маім участку зараз два прытоны, — працягвае Наталля Кісялевіч, пакуль мы назіраем за тым, як міліцыянеры вядуць у грамадскі пункт п'янага чалавека, які, відавочна, ніколі не ведаў ванны. — Праўда, цяпер яны крыху пацішэлі. А што там раней адбывалася — ой-ёй, шумных алкаголікаў падчас чарговага застолля лавілі цэлымі кампаніямі. Аднак усё роўна, па праблемных кватэрах супрацоўнікі ходзяць удваіх, каб пазбегнуць непажаданых эксцэсаў. Хто ведае, якая шалёная думка прыйдзе ў галаву нецвярозаму.

### «Агні прытона спакусліва гарэлі»

Тым часам мы накіроўваемся ў прыватны сектар на процілеглы бок чыгуначнага вакзала. У народзе гэты невялікі квартал каля дыспетчарскай станцыі «Дружная» даўно атрымаў назву «Шанхай». Калісьці да рэвалюцыі там знаходзілася ўрочышча Уборкі. Яно было забудавана настолькі хаатычна і шчыльна, што па некаторых вулачках праехаць было амаль немагчыма. А паколькі вакзал сто гадоў таму знаходзіўся на ўскраіне Мінска, то ніхто не звяртаў на гэта асаблівай увагі. Ішоў час, паступова старыя аднапавярховыя дамы знішчалі, і на іх месцы вырасталі шматпавярховыя будынкі. Аднак адзін квартал прыватнай забудовы усё ж нейкім цудам ацалеў і да нашых дзён.



Праз пару хвілін перад намі паўстае гіганцкі дом, які нагадвае сапраўдны асколак з мінулага. Час тут спыніўся не адно дзесяцігоддзе таму. Сцены ў трохпавярховым будынку зроблены з... дошак, якія фарбаваліся ў апошні раз невядома калі. На другі паверх вядзе вонкавая лесвіца з драўлянымі прыступкамі. Металічныя парэнчы даўно паржавелі. Навокал усё парасло паўметровым бур'яном. Аб тым, што гэты дом увогуле жылы, неспрактыкаваны чалавек можа здагадацца хіба што па спадарожнікавай талерцы каля аднаго з вокнаў...



Тым не менш адна з чатырох кватэр гэтага дома як магнітам прыцягвае да сябе ўсіх прывакзальных аматараў спіртнога.

— Тут жыве пенсіянерка, якая раней працавала на чыгунцы і атрымала ў гэтым доме жыллё. Вельмі часта людзі з суседніх кватэр тэлефануюць у міліцыю, скардзячыся на чарговае зборышча алкаголікаў. Завітваюць сюды і раней судзімыя. Узімку любяць грэцца людзі без пэўнага месца жыхарства. Адным словам, тут сапраўднае прыстанішча для невядома каго. Няма нічога дзіўнага, калі, крый Божа, нецвярозы госць засне з непатушанай цыгарэтай. І гэтае сядзенне на бочцы з порахам працягваецца ўжо не адзін год...

Разам з інспектарам заходзім у кватэру. Хаця і кватэрай гэтае жытло назваць можна хіба што ў фантастычным творы. Гасцей з вуліцы адразу сустракае ўстойлівая сумесь паху чаду і загрувашчанага памяшкання, якое не праветрывалася днямі. Аб тым, што тут знаходзіцца кухня, нагадвае толькі старэнькая забруджаная газавая пліта. Праз запыленыя вокны сонечнага святла пранікае мала. Пра тое, што цывілізацыя не пакінула гэтую кватэру канчаткова, сведчыць хіба што энергазберагальная лямпачка. Сама ж гаспадыня жытла сядзіць у суседнім пакоі і абыякава глядзіць тэлевізар...

— Што ў вас адбылося два дні таму? Алкаголем не злоўжываеце?

— Ну балерына нейкая была з мужыком — я яе справадзіла.

— У вас тут дыхаць няма чым. Чаму вы іх увогуле сюды пускаеце?

— Не выпіваю я з імі.

— Няўжо? — парыруе інспектар. — Колькі разоў вас лавілі на гарачым? А колькі разоў я да вас заходзіла дзеля прафілактыкі і бачыла вас нецвярозай?

— Ну ці мала з кім я п'ю? — гутарка пачынае набываць анекдатычны характар. — Я маю права рабіць у сваёй хаце ўсё, што хачу. Але я не злоўжываю.

— Распісвайцеся ў вынесеным афіцыйным папярэджанні. Калі яшчэ ўбачым гэта, то наступствы будуць цяжэйшымі. І, дарэчы, адкуль у вас назбіралася столькі пустых бутэлек? Цэлы пакет стаіць. Вы ж самі кажаце, што не выходзіце з дома.

— Я не п'ю.

— Ну бутэлькі што, матэрыялізаваліся з нічога?

— Хлопцы заходзілі.

— Якія хлопцы, вакзальныя?

— Не вакзальныя.

— А хто?

— З рынку прыязджалі, — неахвотна адказвае жанчына.

— Я спадзяюся, што больш такога не будзе? Зразумелі? Каб сюды ніводны выпівоха не заходзіў...



У адказ — маўчанне...

— «Хлопцы з рынку» — гэта, як правіла, тыя людзі, хто калісьці меў канфлікт з законам. Зачастую яны не маюць ніякай прафесіі, з дакументаў у іх хіба што толькі пашпарт. Зарабляюць сабе на жыццё грузчыкамі на буйных рынках, — гаворыць інспектар, пакуль мы паціху спускаемся з лесвіцы. — Зразумела, што ў чалавека з судзімасцю выбар месцаў для ўладкавання даволі абмежаваны. Але іх месца сустрэчы, як кажуць, змяніць нельга. Чаму я абмежавалася на кватэры адной размовай? Што можна зрабіць, акрамя як правесці растлумачальную гутарку з гэтай жанчынай? Мяркуйце самі. Ёй 73 гады, яна амаль не выходзіць у двор. Ежу ёй, хутчэй за ўсё, прыносіць прывакзальная брація. За гэта і атрымліваюць часовы дах над галавой. Што з гэтай бабулі ўзяць? У лячэбна-працоўны прафілакторый накіраваць яе нельга з-за паважнага ўзросту. Не саджаць жа яе ў клетку... Шмат галаўнога болю нам дастаўляюць гандлёвыя пункты, дзе ўначы прадаюць алкаголь. Для іх што галоўнае? Абы толькі збыць прадукцыю. А пасля ўвесь цяжар наступстваў кладзецца на нашы плечы.

Не пазайздросціш прывакзальным участковым. Мы што: прынялі ўдзел у рэйдзе з імі і пайшлі. А яны засталіся. Ім тут працаваць кожны дзень.

На сацыяльнае дно тэарэтычна можа апусціцца кожны чалавек. Згарэў дом, празмерная цяга да алкаголю, вялікія праблемы ў сям'і, судзімасць за плячыма — усё гэта падштурхоўвае чалавека да таго, каб знайсці лёгкі, на першы погляд, варыянт рашэння праблемы — пачаць бадзяжнічаць. Тым больш што зараз няма крымінальнай адказнасці за лайдацтва, аб чым рэгулярна з настальгіяй успамінаюць міліцыянеры. Без дапамогі міліцыі разарваць замкнёнае кола новаму госцю «прытонаў» з кожным днём становіцца ўсё цяжэй, у тым ліку і з-за ўплыву новых «сяброў» па бутэльцы сугравальнага. Так вось і з'яўляецца ў вялікім горадзе чарговы валацуга... А значыць, сумаваць участковаму на працы не прыйдзецца.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ**

# МЯСЦІНЫ, ЗНІТАВАНЫЯ З ДУШОЙ

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Уздоўж Бярозаўкі-ракі — вёска з назвай Радзюкі*

**На ўзбярэжжы Бярозаўкі, прытоку Дзісны, з правага боку шашы калісьці стаяў маёнтак паноў Бароўскіх, якія належалі да знакамітага шляхецкага роду і мелі ўласны герб «Ястрабец». Старэйшы прадстаўнік роду Антон Бароўскі ў 1825 годзе набыў гэты маёнтак у графаў Бжастоўскіх (Brzostowskich). Так мястэчка Радзюкі, што на Шаркаўшчыне, стала належаць гэтай сям'і. І хоць гісторыю Радзюкоў, па сцвярджэнні глыбоцкага краязнаўца Уладзіміра Скрабатуна, можна «вывесці» з XVII стагоддзя, я хачу расказаць менавіта пра Радзюкі роду Бароўскіх.**

Радзінная спадчыннасць паноў Бароўскіх вельмі багатая. Сярод слынных ураджэнцаў Радзюкоў — вайскоўцы вышэйшых чыноў, флоцкія інжынеры-вынаходнікі, знакамітыя навукоўцы. Лёсы гэтых людзей моцна залежалі ад таго, на службе якой улады яны знаходзіліся: спачатку Рэчы Паспалітай, потым Расійскай імперыі, а затым і Польшчы.

Старэйшы з роду Эдвард Бароўскі (1818—1897) служыў палкоўнікам расійскай арміі. Падчас Крымскай вайны быў адзначаны за абарону Севастопаля.

Яго сын Гжэгаж Бароўскі (1856—1918), ураджэнец Радзюкоў, інжынер-механік, палкоўнік расійскай арміі, здзейсніў падарожжа вакол свету пад ветразямі вучэбнага карабля. Скончыў Марское ваенна-інжынернае вучылішча ў Кранштаце. У Францыі і Англіі вучыўся пабудове караблёў. Працаваў на верфях Севастопаля і Мікалаева. Удасканальваў распрацоўкі паравых катлоў. Не парываў сувязяў з радзімай. Пашыраў маёнтак, паляпшаў сельскую гаспадарку, пабудаваў вадзяны млын.

Дзякуючы яго стараннем паўстала першая бруканка замест драўлянага насцілу каля капліцы Маці Божай Вастрабрамскай у Вільні (у той час губернскім горадзе нашага краю). Памёр у Пецярбургу.

Севярын Бароўскі, таксама ўраджэнец Радзюкоў, брат Гжэгажа, быў інжынерам-механікам. Атрымаў чын генерала. Падчас расійска-японскай вайны, у бітве пад Цусімай, бачачы непазбежнасць капітуляцыі, адмовіўся ад выратавання і затапіў браняносец «Сысой Вялікі». Уратавалі яго японцы, узяўшы ў палон. Пасля вайны працаваў дзяржаўным кантралёрам пры будаўніцтве караблёў. Памёр у 1935 годзе ў маёнтку жонкі ў Браслаўскім павеце.

**Сярод слынных ураджэнцаў Радзюкоў — вайскоўцы вышэйшых чыноў, флоцкія інжынеры-вынаходнікі, знакамітыя навукоўцы.**

Апошні ўладальнік маёнтка Радзюкі — Вацлаў Бароўскі (1888—1961), прафесар, педагог Віленскага ўніверсітэта. У дзень яго нараджэння каля маёнтка быў пасаджаны дуб. Высокі, магутны, разгалісты, 125-гадовы, ён расце цяпер ужо на цэнтральнай сядзібе сельгаспрадпрыемства імя Ф.Г. Маркава як сведка даўніны і жыцця слынных ураджэнцаў Радзюкоў. Вацлаў Бароўскі і яго жонка Браніслава з роду Грабоўскіх (таксама педагог) прыязджалі ў маёнтак з Вільні толькі на летнія канікулы.

У 1930 годзе, згодна з «Даведнікам Дзісненскага павету», у маёнтку налічвалася 153 дзесяціны зямлі, лес, 48 чалавек (арандатары, запашнікі, парабкі, млынары). Маёнткам кіраваў аканом, зямля здавалася ў арэнду.

...Вялікі сямігектарны сад, разбіты папярэднімі ўладальнікамі, аранжарэі, экзатычныя расліны, кветкі, паркавыя алеі з бяроз, ліп, сосен, прысады з ляшчыны, бэзу, язміну — усё радуе вока. Побач сярэбранай стужкай уецца рака Бярозаўка. З пакояў даносяцца гукі паланэза, мазуркі. Па запрашэнні госці з задавальненнем едуць у Рай Дзюкі (Дзюка — жаночае імя ад «Ядзюнька»). Па-польску гучыць Радзюкі. Такой версіі назвы Радзюкоў прытрымліваюцца прадаўжальнікі роду Бароўскіх, якія жывуць у горадзе Гданьску ў Польшчы.

Усе тры сыны гаспадароў Вацлава і Браніславы Бароўскіх стануць высокаадукаванымі людзьмі, прадоўжаць свой род, але на зямлі Польшчы, і толькі аднаму з іх, прафесару біяхіміі Эдварду Бароўскаму, будзе наканавана вярнуцца на малую радзіму праз 70 гадоў.

Падзеі 1939 года, калі Эдварду было толькі 14 гадоў, кардынальна змянілі далейшы лёс і гаспадароў маёнтка, і простых людзей. У сядзібе былі адкрыты хата-чытальня і клуб. Пасля Вялікай Айчыннай вайны будынак разабралі і перавезлі кудысьці, а гаспадарчыя пабудовы (свірны, хлявы, каморы) выкарыстоўваліся створаным калгасам, рэарганізаваным з часам у буйны саўгас.

Амаль на месцы маёнтка пабудуюць кантору саўгаса, узвядуць абеліск-помнік загінулым землякам. На тэрыторыі былой сядзібы Бароўскіх паўстануць гандлёвы цэнтр, двухпавярховыя будынкі сельскага Савета і пошты, ФАПа і стацыянарнага аддзялення райбальніцы. Вёска будзе разбудоўвацца ўдоўж і ўшыр.

У гады адраджэння вёскі ў пачатку XXI стагоддзя па дзяржаўнай праграме, калі Радзюкі атрымаюць статус аграгарадка, зменяцца знешні выгляд і інфраструктура. У гістарычнае месца пераедзе бібліятэка, сельскі Дом культуры, вырасце новая вуліца на месцы старога саду з назвай Садовая. Не ведаем, не памятаем свайго мінулага. А трэба было б у гонар людзей, якія тут нарадзіліся і пакінулі адметны след у гісторыі, назваць яе вуліцай Бароўскіх. Магчыма, не было б сучасных Радзюкоў, каб не стаяў на ўзбярэжжы Бярозаўкі маёнтак, ураджэнцы якога не зняважылі гонар роднай зямлі, пранеслі праз жыццё годнасць свайго роду і захавалі памяць пра Бацькаўшчыну і любоў да яе.



Сучасныя Радзюкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Высока ў неба ўзносяцца верхавіны старых бяроз, сосен, бліжэй да былога маёнтка — ліп. Гэта рэшткі былых паркавых алей. Захавалася частка саду. Ён густы і цёмны, яго завуць «дзікім». Берагі Бярозаўкі зараслі вольхамі, вербалозамі, ляшчынай, ажынай. Адсюль, з роднага берага 84-гадовы прафесар Эдвард Бароўскі з Гданьска (працуе ў галіне фармацыі, мае больш за 70 патэнтаў вынаходніцтваў) выкапаў саджанец ляшчыны на памяць пра родную зямлю. Адбылося гэта ў 2009 годзе, калі ён з роднымі прыехаў на сваю радзіму. Тут іх пазнаёмілі з дачкой былога млынара Надзеяй Лазовік. Іх сем'і сябруюць дагэтуль. Палякам падабаюцца беларусы — добразычлівыя, ветлівыя, гасцінныя людзі. Радзюкоўская зямля ляжыць пад буслінымі крыламі. Для роду былых уладальнікаў і для радзюкоўцаў, якія пабудавалі сучасныя Радзюкі, зямля гэта адзіная і родная. Бацькоўская. Мясціны, знітаваныя з душой.

*Радзюкоўская зямля!*
*Ты бацькоўская, святая.*
*Пад буслінымі крыламі*
*тут спакон вякоў ляжыць.*
*Цябе Бацькаўшчынай мілай,*
*родным краем называем,*
*Дзе сярэбранаю стужкай*
*удаль Бярозаўка бяжыць.*

**Людміла АРДЫНСКАЯ.**

■ Літаратурная гасцёўня

# «ЖЫЦЦЁ — ПАДАРОЖЖА СЯРОД ВОБРАЗАЎ, СІМВАЛАЎ І... СПАКУС»

**Заўсёды прыемна знаёміць чытача з новай кнігай. Апавяданні Аляксандра Брыта друкаваліся ў часопісах «Нёман» (№6, 2012, №1, 2013) і «Маладосць» (№11, 2011). А зусім нядаўна выйшлі асобнай кніжкай у выдавецкім доме «Звязда». Свой зборнік апавяданняў аўтар назваў «Кіно». Аглядальнік «Звязды» гутарыць з Аляксандрам Брытам у рэжыме анлайн.**

**— Бессэнсоўна пытацца ў пісьменніка, якім чынам яго сэрца ўмясціла гэтульki людской болі. Але запытаюся: афганскія матывы ў апавяданні «Счастливчик Чарли» — гэта вынік вашага асабістага ваеннага вопыту?**

— Пачаць я ўсё ж хацеў бы з таго, чым наогул для мяне з'яўляецца пісьменніцтва, як я яго сабе ўяўляю. Перш за ўсё стаўлюся з вялікай павагай да той літаратуры, якую беларусы называюць мастацкай, рускія — художественной, палякі — «пенкнай» (ад польск. piekna —- прыгожая), немцы — прыгожай (ад ням. schöne). Што гэта за літаратура? Гэта тая літаратура, тыя тэксты, якія ствараюцца з дапамогай мастацкіх дэталяў, вобразаў, прыёмаў. Гэтая літаратура заўсёды фіктыўная, бо свядома выдумана з мэтай апавядання нейкай чалавечай гісторыі. І тым не менш (калі твор напісаны якасна) тая ці іншая чалавечая гісторыя нас турбуе, прымушае спачуваць і перажываць. Але ж навошта чалавеку патрэбна перажываць нейкія фіктыўныя гісторыі? Мне здаецца таму, што кожнае індывідуальнае перажыванне звязана з чалавечай памяццю, бо ўспамін — гэта перажыванне пасля перажывання. Можа быць, такім чынам чалавек падсвядома аналізуе сваё жыццё, свой лёс, свае ўчынкі. Праз вобразы, праз сімволіку, праз чужыя чалавечыя адносіны. Бо літаратура творча капіруе жыццё, яна, канешне, другасная ў дачыненні да жыцця. Жыццё ж, па сутнасці, ёсць падарожжа сярод сімвалаў, і добрая літаратура гэтую сімволіку адлюстроўвае.

...Што ж тычыцца вашага пытання, то я служыў у Афганістане ў 1985-1987 гадах.

**— Раскажыце пра сябе. Тое, што палічыце магчымым. Чытачу, якому спадабаецца ваша кніга, будзе па-чалавечы цікава. Як кажуць, мае права.**

— Прызнацца, я ведаю толькі адно права чытача: чытаць альбо не чытаць. Наконт іншых правоў не зусім упэўнены. Але ж што тычыцца мяне, то тут усё проста: мой рост 1 метр 82 сантыметры, вага — каля 82 кілаграмаў. Калісьці, безумоўна, я не меў ні такога росту, ні такой вагі — быў маленькім, дробным і кволым. І мая мама, дай ёй Бог здароўя, адпраўляла мяне з Мінска да сваёй маці — да маёй роднай бабулі — Фёклы Мінаўны ў Багушэўск, пад Віцебск. У Багушэўску я піў казінае малако (каб быць упартым) і хадзіў да нашых сваякоў — Канапелек (бо любіў туды хадзіць). Мая бабуля была роднай сястрой бацькі народнай артысткі БССР Зінаіды Канапелькі, Ігната. Дарэчы, мая бабуля Фёкла Мінаўна Канапелька, як і яе пляменніца, нарадзіліся у вёсачцы Шыркі — той самай, дзе нарадзіўся і Пётр Міронавіч Машэраў.

Шчыра кажучы, хадзіў я да Канапелек не толькі таму, што быў іх сваяком, але і таму, што вельмі любіў кіно. Бо родны брат Зінаіды Канапелькі Валодзя меў жонку Ніну, якая працавала ў кінатэатры і прапускала мяне і свайго сына Федзьку бясплатна. Так узнікла мая ўстойлівая любоў да вялікай ілюзіі — кіно. У той жа час, здаецца, я стаў разбірацца і ў жартах, бо аднойчы незадоўга да кінасеанса Федзька, хітра прыжмурыўшы вока, сказаў: «Я табе таксама кіно зараз пакажу!» — і пакінуў мяне каля свайго задзірлівага пеўня, які ледзь мне не кінуўся ў вочы. Я быў маленькі, але жвавы, і выратаваўся. А мая дарагая бабуля потым сказала: «Ай-яй-яй, але ж і разумны гэты твой Федзька! Да такога дальбог сам Машэраў бы не дадумаўся!» А бацька мой сказаў тады: «Няма чаго рабіць Машэраву, як пра ўсялякія глупствы думаць! Чулі вы, што Пётр Міронавіч сабраўся метро будаваць?!» Вось так дзякуючы кіно, Федзьку Канапельку і яго пеўню ў Мінску і было пабудавана метро...

**— Жартуеце?**

— Самую крышачку. На самой справе вось што пісала газета «Комсомольская правда» (ад 20 лютага 2004 года): «Возможно, образ Зинаиды Конопелько и возник перед Петром Машеровым, когда он слушал «Александрыну» в исполнении Борткевича. Дело в том, что Конопелько и Машеров были знакомы — они родились в одной деревне, и Петр Миронович считал Зинаиду символом женской красоты!» То бок гэтая цытата ў пэўным сэнсе супадае з маімі словамі аб тым, што ўспамін — гэта перажыванне пасля перажывання...

**— Ну што ж, пагартаем вашу кнігу. Як вы лічыце, у жыцці часта ёсць месца... цуду — такому, якое здарылася ў фінале апавядання «Раскадровка» (http://www.lim.by/limbyfiles/nem1-2013.pdf)? Вы далі надзею чытачам, дакладней — чытачкам. Наколькі яна абгрунтаваная? У жыцці варта проста чакаць такога вось цуду ці ўсё ж патрэбна нешта рабіць? Нават калі гэтае «нешта» не вельмі праведнае (скажам, аблічванне наведвальнікаў рэстарана). Затое прыцягне ўвагу «прынца»...**

— Памятаеце фразу з рамана Міхаіла Булгакава «Майстар і Маргарыта»? «Ходит, ходит один с козлиным пергаментом и непрерывно пишет. Но я однажды заглянул в этот пергамент и ужаснулся. Решительно ничего из того, что там записано, я не говорил». Я хачу сказаць, што часам людзі адно аднаго не разумеюць. «Нам не дано предугадать, как наше слово отзовется...» Звычайна пісьменнікі стараюцца не тлумачыць, што яны мелі на ўвазе ў тым ці іншым сваім творы. Я ж зараз расшыфрую сваё самае «банальнае» апавяданне. Апавяданне «Раскадровка» адсылае нас да двух літаратурных твораў: да апавядання амерыканскага пісьменніка О. Генры «Дары вешчуноў» і рамана рускага празаіка Міхаіла Булгакава «Майстар і Маргарыта». Калі «Дары вешчуноў» згадваюцца ў «Раскадроўке» як нешта, безумоўна, светлае, пазітыўнае, то «Майстар і Маргарыта» там наогул не згадваецца. Не згадваецца, але ж сімволіка «Майстра» чамусьці разліта амаль на кожнай старонцы апавядання. Чаму? Таму што Булгакаў не пісаў гісторыю аб каханні, а пісаў раман пра д'ябла. І вось што атрымліваецца: дзяўчынка, якая калісьці хацела зняць фільм па матывах светлага апавядання О.Генры «Дары вешчуноў», так яго і не здымае. Наадварот, яна выходзіць замуж, з'язджае за мяжу, становіцца не рэжысёрам, а афіцыянткай, знаходзіць сабе працу спачатку ў адным рэстаране, потым — у другім, а затым — у рэстаране... «Воланд». Там яна аблічвае кліентаў і нарэшце ўлюбляецца ў бізнесмена, які таксама марыў калісьці зняць «Дары вешчуноў», але таксама чамусьці іх не зняў... Красамоўнае прозвішча бізнесмена — Аляксандр ЛІХАдзіеўскі — таксама анічога не гаворыць? І вы па-ранейшаму думаеце, што слова «раскадроўка» мае толькі адно кінематаграфічнае значэнне? Слэнгавыя словы «закадрить», «кадр» ні пра што не кажуць? Адным словам, ні аб якіх цудах я не пісаў, ніякіх надзей чытачам альбо чытачкам не даваў. Гаворка ідзе пра спакусу, а яна, безумоўна, можа выглядаць як цуд. З гэтым я магу пагадзіцца.

**Літаратура творча капіруе жыццё, яна, канешне, другасная ў дачыненні да жыцця. Жыццё ж, па сутнасці, ёсць падарожжа сярод сімвалаў, і добрая літаратура гэтую сімволіку адлюстроўвае.**

**— Добра. Іншае ваша апавяданне — «Ты только чирикни» (http://www.lim.by/limbyfiles/nem6_2012.pdf). Ці бывае, каб Так пашанцавала ў чужой краіне, як адстаўному палкоўніку Глебаву? Пашанцавала з перакладчыцай, якую выбраў з трох і атрымаў супернадзейную памочніцу. Са святарам і таксістам. Казачна пашанцавала з прастытуткай, надзвычай інфармаванай і нават смелай. Такое шанцаванне выклікае, прабачце, недавер. І ворагі ў гэтых добрых людзей нейкія напалову рэальныя, як нежывыя. (Магчыма, таму, што нават партрэты не выпісаны.)**

**І яшчэ. Ці зможа наш даволі дасведчаны і крыху скептычны чытач паверыць еўрапейскай Фемідзе, здольнай прыслухацца да гора бацькі і «раскруціць» справу аб гібелі яго дачкі? І якія ён, чытач, павінен зрабіць высновы з сумнай гісторыі, што здарылася з мінскай дзяўчынкай, нанятай папрацаваць на Кіпр і трапіўшай да гандляроў «жывым таварам»? Вы напісалі гэтае жорсткае апавяданне для «прафілактыкі»? (Выпірае некаторая зададзенасць.) Спадзяюся, не па заданні Дзяржкампрацы, што кантралюе працэсы працоўнай міграцыі. Прабачце за такі жарт.**

— Вы ведаеце, у жыцці ўсё бывае. Усё. Нават такое, што мы сабе і ўявіць не можам. Жыццё — галоўны драматург, і тое, што кожны дзень выдумляе жыццё, ніколі не выдумае ні адзін нават самы фантастычны пісьменнік. «Жыццё часам бывае настолькі падобнае на казку, — гаварыў наш класік Уладзімір Караткевіч, — што нельга не ўскрыкнуць: «Ды не можа гэтага быць!» Таму што жыццё само прапануе гісторыі, а кожная гісторыя, у сваю чаргу, патрабуе той ці іншай зададзенасці. Драматызм гісторыі «Ты только чирикни», характар галоўнага героя, саспенс апавядання псіхалагічна патрабаваў жорсткай зададзенасці. Што тычыцца чытача, прафілактыкі і г.д., то, на мой погляд, літаратура — не паліклініка, а чытач — не яе пацыент.

Літаратура не робіць чалавека лепшым. Мастацкая літаратура — фікцыя, выдумка, вытанчанае, але штучнае другаснае падарожжа сярод сімвалаў. І яшчэ літаратура — гэта спроба суперажывання. Здараецца, што пакуль нам самім не забаліць, іншага чалавека мы можам і не зразумець. Праўда, ёсць людзі, якім нават будзе моцна балець, але ж усё роўна боль другога чалавека яны не пачуюць. Людзі — розныя. Пакуль што не кланаваныя. Гэта жыццё.

Наконт жа «нявыпісаных партрэтаў» адкажу так: калі вы наводзіце аб'ектыў камеры на галоўнага персанажа і хочаце добра зняць менавіта яго твар, то ўсе астатнія персанажы будуць крыху размытыя.

**— Злосная жонка, амаль фурыя, ад якой збег (насустрач смерці) Леў Мікалаевіч... Жонка Аляксандра Сяргеевіча, вінаватая ў дуэлі (а значыць, і смерці) Пушкіна... А цяпер пад грамадскае асуджэнне трапляе і жонка Агінскага, якога ў народзе любяць не менш за класікаў літаратуры. Калі вы так пераканаўча распавядалі ў сваім апавяданні «Кино» пра халоднасць княгіні Марыі, што стала прычынай эміграцыі і адзінокага дзесяцігоддзя ў старасці Агінскага, — ці былі ў вас на руках нейкія іншыя факты, акрамя аднаго агульнавядомага? Наколькі гэта пэўна, дакладна? А тая размова яго з Напалеонам у Венецыі ў 1807 годзе таксама грунтуецца на дакументах? Справа ў тым, што шырокі чытач не ведае Міхала Клеафаса Агінскага як дзяржаўнага дзеяча Такога маштабу, які і з расійскім, і з французскім імператарамі быў на «кароткай назе». І яго патрэбна пераконваць дакладна выверанымі фактамі. Калі гэта так, то цудоўна.**

**А жонка, якая не разумее творцу, — для грамадства не так ужо і кепска? Інакш «загладжаны», зацалаваны творца не ўзняўся б на такую вышыню. Як вы лічыце? І як часта менавіта так бывае ў жыцці: мужык у жанчыны — Талент, яго прызналі нават пры жыцці, а ёй гэта не трэба...**

— Апавяданне «Кино» — не дакументальная проза. Я не працую ў межах пераказу голых фактаў. Мяне з мастацкага пункту гледжання больш хвалюе лёс чалавека (уяўленне псіхалагічнага адчування чалавека) на пэўным гістарычным этапе. У гэтым апавяданні я паспрабаваў з дапамогай мастацтва асэнсаваць безумоўна дакладныя факты жыцця дзяржаўнага дзеяча, дыпламата і вядомага кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага. Але ж не трэба перабольшваць. Я зусім не ўпэўнены, што Агінскага «ў народзе любяць не менш за класікаў літаратуры». Мне здаецца, Агінскага, за рэдкімі выпадкамі, наогул мала ведаюць. Ведаюць, што ёсць такі паланэз Агінскага. А хто яго напісаў... Тут ужо ўзнікаюць праблемы. Безумоўна, нельга і казаць, што толькі «халоднасць княгіні Марыі стала прычынай эміграцыі і адзінокага дзесяцігоддзя ў старасці Агінскага». Прабачце, не толькі халоднасць Марыі, а ў тым ліку халоднасць Марыі. Праўда, і пра халоднасць тут трэба казаць вельмі ўмоўна, бо халодная яна была ў пэўны час толькі да Агінскага. Знешнія фактары і абставіны асабістага жыцця вымусілі яго да эміграцыі. Факты ўсе дакладныя.

Ну, і нарэшце, Агінскі быў вельмі выхаваным і адукаваным чалавекам, таму ён, зразумела, ні з расійскім, ні з французскім імператарамі не быў на «кароткай назе». Ён быў дыпламатам, грамадзянінам сваёй зямлі, а не Хлестаковым. Ён ведаў, што такое дыстанцыя ў паводзінах і з рускім, і з французскім імператарамі, і, зыходзячы з гэтага, выбудоўваў свае адносіны з імі.

І апошняе. Я не магу сабе ўявіць, як выглядае «загладжаны», зацалаваны творца». Я ведаю толькі адно: калі творца сапраўдны, ён у незалежнасці ад абставін заўсёды ўзнімецца да той вышыні, пра якую ведае толькі ён сам. Але ў жанчыне, якая свядома і віртуозна іграе на пачуццях творцы, няшмат чаго засталося добрага. Перш за ўсё, не для грамадства — для чалавека, які з'яўляецца творцам. Вядома, калі творца жывы чалавек, а не камень або кавалак жалеза.

**— Гераіні вашых апавяданняў — часцей за ўсё жанчыны з моцным характарам (тая ж «каралева рынгу» Аляксандра ў «Последнем джебе»). Але бывае, што гэтая сіла характару служыць не дабру, што было б больш натуральным для Жанчыны, а зусім наадварот. Такія жонка Глебава, і Алена ў апавяданні «На живца», ды і «драпежніца» Паліна ў «Hotel California». Гэта цалкам жыццёвыя персанажы. Здаецца, у апошняе дзесяцігоддзе іх стала больш. (А хіба не? У часы мінулыя адну толькі Соньку Залатую ручку і ведалі з таўром ліхадзейкі. Зараз злачынкай быць не баяцца. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова пагартаць судовую хроніку.) Такія характары — прадукт свайго часу? Дакладней, «безвременья», якое пачалося пасля развалу вялікай краіны? Ці мы нават у гэтым проста капіруем, паўтараем Захад? І якая тут роля пісьменніка? Ён робіць «прышчэпку» і спрабуе лекаваць грамадства? А ён пры гэтым не адчувае сябе Дон Кіхотам у краіне ветраных млыноў? Якія вашы асабістыя ўражанні?**

**Я ведаю толькі адно права чытача: чытаць альбо не чытаць.**

— Пра ролю пісьменніка я ўжо казаў: для мяне пісьменнік не ўрач, не барадаты Мічурын. А чытач — не пацыент лякарні. У лепшым выпадку чытач і пісьменнік — гэта суразмоўцы, якія нешта могуць даць адзін аднаму. Чымсьці абмяняцца. Уражаннем, прыгажосцю хвіліны, дакладным псіхалагізмам жыццёвай сітуацыі. Абмяняцца — цалкам добраахвотна. З аднаго боку, зараз роля пісьменніка занадта завышана, бо шмат хто думае, што пісьменнік можа нешта выправіць у гэтым жыцці. Але гэта ілюзія. А з іншага боку, роля пісьменніка заніжана, бо многія людзі ўпэўнены, што пісьменнік — гэта той, хто проста запісвае словы на паперы альбо на камп'ютары, у той час як пісаць — гэта па-мастацку асэнсоўваць рэчаіснасць. Вы ведаеце, я не падыходжу да творчасці як да бухгалтэрыі. Я не лічу, колькі якіх жаночых ці мужчынскіх характараў мне трэба запісаць у ноўтбук. Я проста жыву, сустракаю людзей, размаўляю, думаю і спрабую па-мастацку асэнсаваць гэты свет. Бо я хацеў бы, каб і чытач таксама жыў, сустракаў людзей, размаўляў і думаў.

Я амаль нічога не выдумляю, бо свет выдумляе за мяне. Я проста ўдасканальваю майстэрства. Грамадства пачынаецца не з пісьменніка, а з таты і мамы. Іх роля — выхоўваць, абараняць, любіць і накіроўваць. Добра, калі яны выхоўваюць, абараняюць, любяць і накіроўваюць разам з някепскімі кнігамі. І добра, калі хлопчык альбо дзяўчынка своечасова зразумеюць, якія дэманы апаноўвалі Ганну Карэніну, спадарыню Бавары альбо беларускага партызана Рыбака. Вось такія мае асабістыя ўражанні.

**— Калі я чытаў вашы творы, было відавочна, што вы ведзяце напружаны пошук формы. І гэта дае свае вынікі. Але іншы раз пошук ператвараецца ў самамэту. Напрыклад, калі невялікі па памерах твор перагружаецца доўгімі (менавіта доўгімі) цытатамі з газет, і ў выніку не «зацёрты» прыём працуе не на тэму, а на аб'ём (прабачце). І адцягвае ўвагу чытача. Я хацеў бы пацікавіцца ў аўтара (магчыма, вы маеце абгрунтаванне): наколькі апраўданым вы самі лічыце такі ход?**

— Шчыра кажучы, зараз я пачуў самае цікавае пытанне. Дзякуй, што яно нарэшце прагучала.

Так, кожны мастак абавязаны ведаць элементарныя законы творчасці. На мой густ, добры тэкст заўсёды, вобразна кажучы, павінен мець мускулатуру. Апавяданні бываюць як аплявуха. Бываюць — як невыразная ўсмешка. Як клічнік альбо пытальнік. Як позірк закаханай жанчыны. Але заўсёды тэкст павінен акумуляваць увагу чытача. Драйв, саспенс у ідэале павінны быць граматыкай любога аповеду. Так, казіно заўсёды выйграе, але, тым не менш, бываюць і выключэнні. Асабіста для мяне тэмы апавяданняў «Кино» і «Счастливчик Чарли» празмерна значныя. «Кино» — апавяданне аб лёсе чалавека, аб жыцці і смерці, аб сувязі часоў, аб бясконцым вяртанні. Памятаеце прозвішча французскага салдаціка Машэра? Такое прозвішча продкі гэтага салдаціка мелі аж да 30-х гадоў дваццатага стагоддзя. І толькі ў 30-я гады да гэтага прозвішча дадалі яшчэ адну літару: Машэра-ў. А вы кажаце, ці можа такое быць ў жыцці? Не можа, а было і ёсць. І вось калі я пра ўсё гэта падумаў, то прыйшоў да высновы, што пра чалавека, якому ў рэанімацыі мрояцца ўрыўкі з незнятага кіно, нельга распавядаць у драйвовым стылі. Бо тэма патрабуе формы, а не наадварот. То бок усё гэта я зрабіў наўмысна і ўсвядомлена. Таму і кампазіцыя гэтага апавядання іншая, хаця ўнутранае напружанне ўсё роўна там таксама ёсць. А што тычыцца «доўгіх цытат», то не выключаю, што і надалей, калі тэма будзе патрабаваць гэтага, ужо іншыя цытаты кропачна таксама з'явяцца на старонках маіх апавяданняў. Можа, інакш. Можа, у больш скарочаным выглядзе...

**— Зараз, калі жадаюць сумна пажартаваць, то кажуць: «Карціна маслам» альбо «Такое вось кіно» — у сэнсе «Такое вось жыццё». І ў гэтых словах прысутнічае ацэнка.**

**Ацэнку чаму, якой з'яве, якім працэсам вы даяце? Кіно — гэта злепак (больш ці менш удалы) з жыцця. Ці вы хочаце сказаць, што жыццё ўжо «лепіць» сябе «по образу и подобию» кіно? Але яно бывае featured рознае, а ў апошні час — усё больш шкоднае для людскога розуму. Сучасны кінематограф шмат зрабіў для разбэшчвання людскіх душ.**

— Мастацкая літаратура — гэта вялікая ўмоўнасць. Толькі так яе і трэба ўспрымаць. Мяркую, што літаратура ўсё ж такі не ацэньвае, а па-мастацку адлюстроўвае. Адлюстроўвае тое, што кожны з нас бачыць у сваім жыцці. Густ, выхаванне і шмат іншых рэчаў афармляюць гэта адлюстраванне. Тое ж самае можна сказаць і пра кінематограф. Так, кіно бывае рознае, але яно заўсёды другаснае ў параўнанні з жыццём. Але не трэба забываць і тое, што заўсёды кіно робяць людзі, а не іншапланецяне. Сёння такі час: словы застаюцца, а сэнсы знікаюць. Постмадэрнізм урываецца ва ўсе сферы. А што такое постмадэрнізм? Калі казаць проста, гэта адсутнасць усіх іерархій і традыцыйных арыенціраў. А ў чалавека павінны быць арыенціры. У адваротным выпадку ён можа даволі хутка заблытацца.

**— Некалькі слоў па матывах вашай антыбрутальнай прытчы «Синдром Алисы». Скажыце, ШТО можа прымусіць чалавецтва спыніцца і штодзённа не рушыць той храм, у якім яно жыве? Аднаго Чарнобыля, аказваецца, мала. Учора вадзіў сваіх школьнікаў, у якіх зараз канікулы, на галівудскі фільм «Пасля нашай эры». Калі верыць яго стваральнікам, то чакае нас усіх даволі сумная перспектыва. Як дастукацца да розуму кожнага і спыніць разбуральны працэс, які ўжо пайшоў?**

— Я не ведаю. У мяне няма адказу на гэтае пытанне. Не выключаю, што нехта іншы на яго ўжо адказаў. Напрыклад, той, хто прачытаў кнігу Уільяма Голдынга «Уладар мух».

Тым не менш «Алісу» лічу адным з лепшых сваіх твораў. Гэта вельмі анімацыйная рэч, якая, на мой погляд, проста просіцца ў мультфільм.

**— З моманту выхаду кнігі прайшоў некаторы час. І вы, відаць, атрымалі першыя водгукі. Якія яны? З кім з чытачоў вам хацелася б паспрачацца, некаму адказаць праз газету.**

— Спрачацца ні з кім я не хацеў бы. Больш люблю слухаць і назіраць, чым гаварыць. А калі казаць пра водгукі, то яны самыя розныя. Водгукі чаканыя. Бо кожнае апавяданне пісаў усвядомлена, уяўляючы сабе свайго чытача. Калі я ў чымсьці памыляўся, людзі і час унясуць свае карэктывы. Гэта нармальна. Жыццё ёсць жыццё. Магу толькі дадаць, што заўсёды яшчэ не надрукаванае апавяданне я даю чытаць сваім знаёмым, сярод якіх ёсць і жанчыны, і мужчыны. (Яны ўсе не пісьменнікі, людзі розных прафесій, статусу, густу.) І вось што цікава. Калі мае знаёмыя прачыталі яшчэ не выдадзеную кнігу, я быў здзіўлены, як яны размеркавалі свае сімпатыі да маіх твораў. Розным людзям падабаліся самыя розныя апавяданні. І нават тыя, пра якія я думаў, што не, гэта не ўспрымуць, — не заўсёды, але добра ўспрымаліся. Я не меркаваў па словах — адчуваў па рэакцыі.

Былі і іншыя водгукі.

Чытачы, якія прачытаюць кнігу «Кіно», могуць мне напісаць (britaleks@mail.ru). Лічу, што вельмі важна чуць іншых.

**— І напрыканцы. Што мы скажам напрыканцы?**

— Напрыканцы я хацеў бы сказаць, што я беларус, які нарадзіўся тут. А замест кропкі давайце паставім шматкроп'е...

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ**




№ 26 (41)

■ Гісторыя і сучаснасць

## Уводзіцца ў абарачэнне паштовая марка «Герб Быхава»

**Аддзяленне паштовай сувязі № 2 горада Быхава праводзіць спецыяльнае гашэнне маркі «Герб Быхава» на канверце «Першы дзень».**



Гэта марка адна з серыі «Гербы гарадоў Беларусі». Раней ужо былі выпушчаны маркі Полацка, Мінска, Гродна, Брэста, Заслаўя, Хойнікаў, Ліды і некаторых іншых гарадоў.

Герб Быхава ўяўляе сабой выяву ў чырвоным полі французскага шчыта дзвюх перакрыжаваных гармат натуральнага колеру і адносіцца да гісторыка-геральдычных помнікаў Беларусі.

Геральдычная тэматыка досыць папулярная сярод філатэлістаў. Такія маркі шырока распаўсюджваюцца не толькі ў нашай краіне, але і часта замаўляюцца з-за мяжы.

Кожны год у нашай краіне звычайна выходзіць дзве маркі з гербамі гарадоў: адна прымеркавана да «Дажынак», другая — да Дня беларускага пісьменства.

У верасні выйдзе яшчэ адна марка з гэтай серыі — «Герб Жлобіна».

## Фэст «Млын» і тры Спасы

**У апошнюю нядзелю лета, 25 жніўня, у музейным комплексе Дудуткі пройдзе фэст «Млын». У яго праграме — святкаванне трох Спасаў і майстар-клас па народнай беларускай кухні з дэгустацыяй.**

Будуць адзначацца Спас Мядовы, Арэхавы і Яблычны. Таму наведвальнікаў чакаюць адпаведныя смачныя падарункі. Як паведаміла арганізатар Дар'я Ільініч, гэта будуць беларуская садавіна, а таксама квас, кісель, пірог, прыгатаваныя ў музеі.

На летняй кухні музейнага комплексу Алесь Белы правядзе майстар-клас па прыгатаванні нацыянальнай стравы. Што за страва — пакуль трымаецца ў сакрэце. Вядома толькі, што яна звязана з танцавальнай культурай, таму і дэгустацыя будзе праходзіць незвычайна.

На вялікай сцэне музея выступіць гурт «Крамбамбуля».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Не прапусціце

## ЁСЦЬ ІМЁНЫ Ў ГАРАДОЎ І ВЁСАК...

Шаноўныя чытачы!

Калі вас цікавіць назва населенага пункта, у якім вы жывяце, калі даўно хацелася даведацца пра гісторыю пэўнай назвы, але не хапала часу зазірнуць у даведнік ці архіў, цяпер «Звязда» дапаможа вам у гэтым. Мы распачынаем новую рубрыку, прысвечаную беларускім тапонімам. Пішыце, і вы не толькі даведаецеся пра штосьці новае, але і ўся краіна зможа прачытаць пра пэўныя гістарычныя, геаграфічныя асаблівасці вашай вёскі, мястэчка ці горада. На ўсе лісты будзе адказваць старшыня Нацыянальнай тапанімічнай камісіі пры Акадэміі навук Беларусі Ігар Капылоў.

Лісты дасылайце на паштовы адрас газеты: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а або на элетронны адрас: **igumenski@mail.ru.**

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

# ШАМЯКІН

Прозвішча Шамякін у асноўным сустракаецца на тэрыторыі Расіі. З гэтым прозвішчам звязаны імёны многіх знакамітых людзей: Рыгор Шамякін — Герой Савецкага Саюза, панфілавец, Міхаіл Шамякін — расійскі жывапісец, скульптар, графік, Анатоль Шамякін — вучоны псіхолаг, філосаф, Мікалай Шамякін — генерал-маёр, герой руска-турэцкай вайны. У старажытнасці сярод прадстаўнікоў княжацкага роду сустракалася прозвішча Шамяка. Так, у летапісах 1434 года згадваюцца галіцкі князь і вялікі князь маскоўскі Дзмітрый Шамяка, асноўны ўдзельнік міжусобных войнаў другой чвэрці XV стагоддзя. Гісторыі ён вядомы яшчэ і тым, што ў 1446 годзе асляпіў свайго брата, маскоўскага вялікага князя Васіля II. Паводле гістарычных дакументаў, у першай палове XVII стагоддзя на Яраслаўшчыне былі вядомыя памешчыкі Шамякавы, а пісцовыя кнігі Наўгародскай губерні зафіксавалі звесткі пра дваранскі род Шамякіных. У рускай мове замацаваўся ўстойлівы выраз «шамякін суд», які ўжываецца ў тых выпадках, калі хочуць падкрэсліць несправядлівасць якой-небудзь думкі, меркавання, ацэнкі. Існуюць дзве версіі адносна паходжання гэтага выразу: першая заснавана на гістарычным факце пра князя Дзмітрыя Шамяку, а другая звязана з народным апаведам пра несправядлівага суддзю Шамяку.


Іван Шамякін.

### Іван Шамякін — вялікі майстар сюжэта

У Беларусі прозвішча *Шамякін* у першую чаргу асацыюецца з асобай аднаго з найбольш папулярных раманістаў — народным пісьменнікам Беларусі, акадэмікам НАН Беларусі, Героем Сацыялістычнай Працы, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Беларусі Іванам Пятровічам Шамякіным.

Нарадзіўся Іван Шамякін 30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і лесніка. Скончыў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў. Прымаў удзел у савецка-фінскай вайне, затым у Вялікай Айчыннай вайне: удзельнічаў у баях пад Мурманскам, у Польшчы, на рацэ Одэр. Пасля дэмабілізацыі перакваліфікаваўся (завочна закончыў Гомельскі педінстытут) і стаў выкладчыкам мовы і літаратуры. Працаваў у вёсцы Пракопаўка Церахоўскага раёна на Гомельшчыне. У розныя гады займаў важныя дзяржаўныя пасады: першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя», старшыня Вярхоўнага Савета БССР, старшыня Беларускага камітэта абароны міру. Памёр 14 кастрычніка 2004 года.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1941 годзе. Найбольш значныя творы: раманы «Глыбокая плынь», «Крыніцы», «Сэрца на далоні», «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль», «Вялікая княгіня», «Злая зорка», аповесці «Шлюбная ноч», «Гандлярка і паэт», пенталогія «Трывожнае шчасце». У творчасці пісьменніка адлюстраваны шырокі тэматычны дыяпазон: жыццё беларускай вёскі ў часы акупацыі, дзейнасць партызан, складанасць барацьбы ў тыле ворага, жанчына і вайна, лёс пакалення, на долю якога выпалі выпрабаванні вайной, праблемы ўрбанізацыі, пошукі душэўнай гармоніі і пакаяння, падзеі Першай сусветнай вайны і грамадзянскай вайны, праблемы Чарнобыля, пытанні захавання агульначалавечых і маральных каштоўнасцяў. Творы пісьменніка перакладзены на многія мовы свету. Па іх зняты фільмы і створаны тэлеспектаклі. Творы Шамякіна заўсёды карысталіся вялікай папулярнасцю. Прычынай гэтага паслужыла творчае майстэрства пісьменніка. Як слушна заўважыў акадэмік У.В. Гніламёдаў, «асаблівасцю творчай індывідуальнасці Івана Шамякіна, стала тое, што пісьменніка перш за ўсё прыцягвалі светлыя бакі жыцця, харaство чалавечых адносін, прыгожыя людзі. Ён умеў знайсці ў звычайным, простым чалавеку нешта такое, што было цікава для ўсіх. Пры гэтым яго ўвагу звычайна прыцягвалі не якія-небудзь экстраардынарныя выпадкі жыцця ці сітуацыі, а жыццё, як яно ёсць, у яго роўнай, штодзённай плыні. Шамякін быў непераўзыдзеным майстрам сюжэта. Рабіў ён гэта не толькі для таго, каб заінтрыгаваць чытача, але і для больш глыбокага раскрыцця чалавечых характараў і абставін, у якіх даводзілася дзейнічаць героям твораў».




Прозвішчы

● Шамяка

◐ Шамякін

### Паходжанне прозвішча

Прозвішча *Шамякін* вельмі старажытнае. Яно вядзе свой пачатак яшчэ з дахрысціянскага часу. У мінулым сустракалася на розных тэрыторыях і сярод прадстаўнікоў розных саслоўяў, не толькі князёў, але і сялян, стральцоў. Таму ў залежнасці ад тэрыторыі бытавання існуюць розныя версіі тлумачэння гэтага прозвішча.

Адна з версій, выказаная знакамітым акадэмікам Трубачовым, звязвае паходжанне прозвішча ад нехрысціянскага імені-мянушкі *Шамяка,* якое ўтварылася з двух слоў: *шы* ў значэнні *«шыя»* і *мяка* ў значэнні *«мяць»*. Такую мянушку маглі даць моцнаму, смеламу, дужаму чалавеку — адным словам, асілку. Аднак чалавек гэты ў народзе меў славу забіякі з-за сваёй здольнасці намяць шыю іншаму.

Вядомая расійская даследчыца А.М. Палякова дапускае сувязь мянушкі *Шамяка* са словам *шамяткі,* якое ў некаторых рускіх гаворках (а дакладней, на тэрыторыі Урала) абазначае *«шпаркі, паспешлівы чалавек».*

Існуе думка, што прозвішча *Шамякін* узыходзіць да каталіцкага варыянта імя *Сіман — Шыман,* якое на беларускай тэрыторыі ўтварыла вялікую колькасць размоўных варыянтаў *Шымук, Шымяк, Шымяка, Шымак, Шымік, Шымук, Шымука, Шэмег* і іншыя.

Асобныя вучоныя (А.А. Зімін) мяркуюць, што гэта прозвішча ўзнікла ў перыяд татара-манголькага нашэсця і непасрэдна звязана з татара-мангольскім словам *чымэху (упрыгожваць), чымэк (упрыгажэнне).*

### Сучасныя Шамякіны

На тэрыторыі Беларусі прозвішча *Шамякін* амаль не сустракаецца, за выключэннем прадстаўнікоў роду Івана Пятровіча Шамякіна, якія жывуць у Мінску. На Гродзеншчыне вядома прозвішча *Шамяка* на тэрыторыі Іўеўскага і Ваўкавыскага раёнаў.

**Ігар КАПЫЛОЎ**

■ На свае вочы

# У БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ ЗНОЙДЗЕНА ЖЫТЛО ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ

**Яго, верагодна, можна датаваць пачаткам І тысячагоддзя, аднак больш дакладную выснову зробяць ужо мінскія археолагі пасля завяршэння раскопак. Археалагічныя раскопкі, якія вяліся ў запаведніку, узначальваў малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Алег Ткачоў. Пад яго кіраўніцтвам працавалі студэнты першага курса гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, а таксама іх выкладчыкі і іншыя валанцёры.**

Да 2007 года ў Белавежскай пушчы быў вядомы толькі адзін археалагічны помнік першабытнай гісторыі — каля вёскі Камянюкі. Папярэдне ён адносіўся да жалезнага веку і трактаваўся як гарадзішча мілаградскай культуры. У выніку разведкі па берагах Лясной, іншых невялічкіх рачулках і вакол пушчы было знойдзена звыш 50 помнікаў археалогіі каменнага, бронзавага, жалезнага веку і больш позняга часу. Улічваючы, што дагэтуль у рэгіёне нічога не было вядома з гісторыі першабытнага жыцця (хто сюды прыйшоў, калі жыў), то ўсе гэтыя матэрыялы можна было лічыць сенсацыяй.


Алег ТКАЧОЎ паказвае месца, дзе знойдзена жытло жалезнага веку.

> **Крыміналіст з'яўляецца на месцы здарэння праз гадзіну, дзве, суткі — а археолаг прыходзіць праз тысячагоддзі.**

Адметна, што на тэрыторыі Белавежскай пушчы ў адным месцы былі знойдзены «розначасовыя» матэрыялы. Тут могуць сустракацца знаходкі, што адносяцца да перыяду «палеаліт — пачатак жалезнага веку», а побач, напрыклад, толькі тыя, што адносяцца да жалезнага веку. Такім чынам можна скласці суцэльную храналогію таго, як ішло жыццё, хто прыходзіў на змену тым ці іншым жыхарам. Алег Ткачоў патлумачыў, чаму ў адным месцы ёсць напластаванні розных часоў:

— Звычайна людзі сяліліся на адных і тых жа месцах, самых зручных. Яны прыходзілі і глядзелі, ці ёсць рака, ці высокае гэта месца, каб падчас паводкі не падтапілася. А ідэальным варыянтам было, калі з аднаго боку ў буйную раку ўпадала невялікая ручаіна. Бо для першабытнага чалавека месца знаходжання паселішча з'яўлялася вызначальным: вялікая рака — гэта рыба, а ручаіна — чыстая вада для піцця. Ідэальным было месца сутыкнення экалагічных зон: з аднаго боку балота, з другога — хваёвы лес, з трэцяга — лісцёвы. Усё гэта спрыяла больш разнастайнаму харчаванню. І, калі штосьці здаралася (напрыклад, у лесе знікала дзічына), жыхарам не даводзілася некуды пераходзіць — яны проста выкарыстоўвалі іншае харчаванне. Менавіта такое месца і тут: Белавежская пушча — а значыць, буйныя лясы на поўнач; на поўдзень — больш узвышаная тэрыторыя, на якой расце сасоннік. Тут жа зліваюцца дзве ракі — Белая і Лясная Правая. Гэта проста рай для жыцця першабытнага чалавека.

На месцы, дзе вядуцца раскопкі, відаць сляды першых плямёнаў (так званых «паляўнічых на паўночнага аленя»), якія хадзілі ўслед за статкамі гэтых жывёл, пасля таго, як адступіў ледавік. Ёсць таксама сляды кудлаеўскай, яніславіцкай культур, прадстаўнікі якіх першымі пачалі аседла жыць у Белавежскай пушчы. Таму атрымалася, што на самых лепшых месцах назапашваліся шматлікія матэрыялы розных часоў, якія знаходзяцца і сёння.

*ЯК ПРАВОДЗЯЦЦА РАСКОПКІ?*

*Спачатку трэба знайсці помнік. Часцей за ўсё ён можа знаходзіцца на высокім месцы, побач з ракой. На паверхні трапляюцца невялічкія каменьчыкі, якія ўяўляюць сабой пэўную цікавасць. Пасля ў некалькіх месцах робяцца шурфы, каб даведацца, дзе мяжа помніка ці найбольш насычаны культурны пласт. Калі ёсць знаходкі, якія цікавяць канкрэтнага археолага, то ў наступным годзе ён можа прыехаць і пачаць капаць.*

*Помнік звычайна разбіваецца на квадратную сетку. І раскоп размяркоўваецца па напрамках свету, каб можна было рабіць больш дакладную фіксацыю. Зямля здымаецца з дапамогай шуфлікаў, невялікімі ўчасткамі. Калі пласт зняты, робіцца зачыстка, усё фатаграфуецца і замалёўваецца. З кожнага пласта-квадрата знаходкі збіраюцца ў асобны пакецік, на якім ёсць паперка, дзе пішацца нумар квадрата і нумар пласта. Пасля таго, як усё сфатаграфавана і зафіксавана, выняты грунт засыпаецца назад. І гэта таксама вельмі важна, бо іначай сценкі раскопу, яго стратэграфія (напластаванні) разбурацца. Пасля, ужо ў Інстытуце гісторыі праводзіцца падрабязны аналіз таго, дзе што знаходзілася, узнаўляецца пэўны малюнак тых месцаў і эпохі.*

Алег Ткачоў расказаў, што кожную культуру можна вызначыць па прадметах ужытку. Напрыклад, у неаліце, калі з'явілася кераміка, гэта можна зрабіць па тэхналогіі і арнаментацыі глінянага начыння:

— У самую старажытную эпоху ў фармовачнае цеста дадавалі шмат раслін, таму яна была лёгкая, порыстая. Пасля была моднай добра загладжаная кераміка. У познім неаліце на тэрыторыі Заходняй Беларусі гаршкі падштрыхоўваліся. У жалезным веку ў керамічнае змесіва дадавалі шмат пяску, жарствы, таму яна больш грубая. Акрамя таго, у кожнай культуры быў свой набор элементаў арнаменту. І, калі мы знаходзім у пэўным месцы элементы нетутэйшага арнаменту, тады можна казаць пра пэўныя міжкультурныя стасункі. Менавіта на тэрыторыі Белавежскай пушчы знойдзены такі «мікс». З аднаго боку, тут сутыкнуліся так званае насельніцтва «ляснога неаліту» — мясцовыя плямёны, — а з тэрыторыі Польшчы пачалі пранікаць плямёны класічнага сярэднееўрапейскага гарызонту, якія ўжо ведалі жывёлагадоўлю і земляробства. Тут была памежная, кантактная зона, і гэта адлюстроўвалася ў керамічным матэрыяле. Так, на адным гаршку мы можам бачыць адначасова як мясцовыя, так і запазычаныя элементы арнаментацыі.

Кераміка, знойдзеная падчас раскопак, спалучае ў сабе рысы як мясцовай, нёманскай культуры, так і сярэднееўрапейскіх культур. Такім чынам, тэрыторыя Белавежскай пушчы (як і ўсё Беларускае Пабужжа) была пэўнай буфернай зонай, мяркуе Ткачоў, адным са шляхоў, праз які ў нашу краіну пранікалі жывёлагадоўля і раслінаводства — з аднаго боку. А з другога, трансфармавалася на захад «ідэалогія» паляўнічых і збіральнікаў — тагачаснага насельніцтва сучаснай Беларусі.


Карэспандэнт «Звязды» і зубр па мянушцы Зураб прысутнічалі на археалагічных раскопках.


Раскоп «Вілы-1».



Такія таблічкі ставяць, каб сфатаграфаваць чарговы этап раскопак.

Навукоўцам удалося аднавіць верхнюю частку неалітычнага гаршка, які быў знойдзены летась. Аздабленне яго адзін у адзін супадае з арнаментацыяй начыння, адшуканага ў 2000 годзе на берагах Мухаўца каля Жабінкі. Гэта вастрадонны гаршчок з вузкім горлачкам, пад краем венца якога ідуць наколы, ямачкі. Ён аздоблены так званым «лінейным штампам», які запазычаны ад заходнееўрапейскіх культур варонкападобных кубкаў і шаравідных амфар. Аднак у мясцовых неалітычных культур была свая асаблівая сістэма аздаблення, характэрная толькі для беларускага рэгіёна Пабужжа, упэўнены археолаг. Гэта быў суцэльны моцны анклаў, які меў добрыя стасункі як паміж сабой, так і з Захадам.

Алег Ткачоў адзначыў, што за некалькі гадоў раскопак, якія актыўна вядуцца ў Белавежскай пушчы, атрымана вялізная колькасць знаходак. Толькі летась было знойдзена 7000 артэфактаў, калі ўлічваць самыя дробныя. Тых, якія можна прэзентаваць, паказаць, — больш за сотню. Напрыклад, на аб'екце «Камянюкі 2» за адзін археалагічны сезон было знойдзена больш за 12000 артэфактаў.

> **На аб'екце «Камянюкі 2» за адзін археалагічны сезон было знойдзена больш за 12000 артэфактаў.**

Даўно вядзецца размова пра стварэнне музея археалогіі ў Белавежскай пушчы. Гэта мог быць музей пад адкрытым небам, калі цалкам выкопваецца пэўнае паселішча і на матэрыялах, якія ў ім ёсць, ствараюцца пэўныя рэканструкцыі. Ставяцца будынкі, тут жа захоўваюцца знойдзеныя матэрыялы. Пакідаецца і пэўны ўчастак, на якім відаць, як вядуцца археалагічныя раскопкі. Праект музея археалогіі пад адкрытым небам ужо распрацаваны, аднак пакуль няма фінансавання. Аднак у новым музеі прыроды і гісторыі Белавежскай пушчы зараз створана невялікая археалагічная экспазіцыя з матэрыялаў, што былі атрыманы падчас першых раскопак.

Для Алега Ткачова археалогія — любімая справа. Ён падзяліўся сваімі думкамі адносна таго, чым жа яна яго так прываблівае:

— Гэта вельмі цікавы занятак у тым плане, што даводзіцца наведваць розныя мясціны. А для гэтага трэба быць рамантыкам. Каб не такая, хоць і вельмі сціпла аплачваемая праца, я ўсё лета сядзеў бы ў душным кабінеце за камп'ютарам. А тут атрымліваецца спалучэнне фізічнай і інтэлектуальнай дзейнасці: усё лета капаеш, зімой гэта замалёўваеш, пішаш справаздачы. Мяне з дзяцінства цікавілі загадкі, тут іх надзвычай шмат... Археалогію часта параўноўваюць з крыміналістыкай. Але крыміналіст з'яўляецца на месцы здарэння праз гадзіну, дзве, суткі — а мы прыходзім праз тысячагоддзі і па маленькіх кавалачках, артэфактах, стараемся аднавіць не асобны факт, а гісторыю.

Дарэчы, уся кампанія валанцёраў і навукоўцаў падчас раскопак жыла ў прыватным доме мясцовага жыхара Сяргея Нікіцюка. Хтосьці з іх адмовіўся ад працы з вялізным заробкам, каб займацца археалогіяй, хтосьці проста патраціў на гэта сваё лета, хтосьці толькі мроіць пра навучанне на заветнай спецыяльнасці і пакуль практыкуецца на раскопках. Аднак пасля такой практыкі ўсе яны, падаецца, навучыліся капаць углыб не толькі зямныя нетры, але і падзеі, і факты. Бо толькі так, калі знаходзіш і захоўваеш дробязі, робіш каштоўныя знаходкі, і пачынае вымалёўвацца агульная карціна жыцця.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ, фота аўтара.**

*Камянецкі раён*

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## о проекте строительства административного помещения в жилом доме № 21Б (по генплану) и встроенного отделения банка в жилом доме № 21А (по генплану) в составе объекта «Строительство двух многоквартирных жилых домов серии М464-У1 со встроенным отделением сбербанка, продовольственным магазином и административным помещением на месте жилого дома № 21 по генплану в микрорайоне «Каменная Горка-4»

**Информация о застройщике**

Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник–четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30 – 16.15, обед – 12.45 – 13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 54 по ул. Матусевича.
2. Жилой дом № 96 по ул. Нестерова.
3. Жилой дом № 29 по ул. Казимировской.
4. Жилой дом № 7 по ул. Киреенко.

**Информация о проекте строительства**

Цель проекта – строительство административного помещения и встроенного помещения банка в составе многоквартирных жилых домов.

Начало строительства – март 2013 г., ввод дома в эксплуатацию – август 2014 г.

Положительное заключение государственной экспертизы № 1096-15/12 от 29.11.2012 г.

Местоположение строящихся многоквартирных жилых домов – г. Минск, Фрунзенский район, жилые дома № 21Б, № 21А по генплану в составе объекта «Строительство двух многоквартирных жилых домов серии М464-У1 со встроенным отделением сбербанка, продовольственным магазином и административным помещением на месте жилого дома № 21 по генплану в микрорайоне «Каменная Горка-4».

**Характеристика объекта**

Объекты строительства – встроенное отделение банка общей площадью 317,92 м² и встроенное помещение административного назначения общей площадью 101,62 м², расположенные на первых этажах многоквартирных 10-этажных жилых крупнопанельных домов № 21А и № 21Б соответственно серии М464-10-У1. Помещения строятся без выполнения в полном объеме подготовительных работ под отделку стен и потолков, а также без выполнения работ по внутренней отделке помещений (без наклейки обоев, покраски, облицовки), без покрытия полов, без встроенной мебели, без установки дверных блоков в межкомнатных перегородках, санитарных приборов и оборудования (кроме унитаза и приборов учета воды).

Стены: наружные в обоих помещениях и межкомнатные перегородки в административном помещении – железобетонные панели.

Перекрытия – железобетонные.

Окна – деревянные с заполнением двухкамерным стеклопакетом.

Отопление – центральное.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, остекление лоджий (в административном помещении). Планировка отделения банка будет разрабатываться по заданию конкретного инвестора.

Стоимость 1 м² общей площади объектов долевого строительства на дату опубликования проектной декларации:

встроенное отделение банка – **17 200 000 руб.;**

встроенное помещение административного назначения – **15 600 000 руб.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 4012 от 27 декабря 2012 г., свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 18 февраля 2013 г. № 500/451-6181. Площадь земельного участка – 0,2753 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – август 2014 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 4012 от 27 декабря 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

**Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир:**

